АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю
"БЕЛАРУСЫ РАСІІ ЗРАБІЛІ ЯШЧЭ АДЗІН КРОК У БУДУЧЫНЮ"
2 стар.

ДЫПКУР'ЕР
3 стар.

З ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ
ЦІ ЗДОЛЬНЫЯ АЙЧЫННЫЯ ФАРМАЦЭЎТЫ ЗАДАВОЛІЦЬ ХВОРЫХ?
3 стар.

ДА 120-ГОДДЗЯ ПЕСНЯРОЎ
АБ ПЕРШАЙ СУСТРЭЧЫ Янкі КУПАЛЫ І Якуба КОЛАСА Ў СМОЛЬНІ
4 стар.

ВЕРНІСАЖ
"ПЕСНЯ АБ РАДЗІМЕ"
Тамары КІРШЫНАЙ
5 стар.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ: ЛАТВІЯ, ІЗРАІЛЬ, УКРАІНА
6 стар.

ПАЭТЫЧНАЯ ІМПРЭЗА
САНЕТЫ Васіля ЖУКОВІЧА
6 стар.

АСОБА Ў БЯЗМЕЖЖЫ ЧАСУ
СТАРОНКІ БІЯГРАФІІ
Ігната ДАМЕЙКІ (заканчэнне)
7 стар.

ВАНДРОЎНЫЯ БЫЛІ Ягора КОНЕВА "ПЛАНЁР"
8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі
Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

16 кастрычніка 2002 года, № 42 (2808) Цана 148 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

ШВЕЙЦАРСКІ КАПІТАЛ У МІНСКУ

Нацыянальны банк Беларусі прыняў рашэнне аб дзяржаўнай рэгістрацыі новага банка – ЗАТ "УБС Банк".

Новая фінансавая ўстанова ствараецца са стопрацэнтным замежным капіталам — швейцарскім. Што датычыць статутнага фонду банка, то ён на момант рэгістрацыі складаў больш за пяць мільёнаў еўра. Цяпер у Беларусі дзейнічаюць пяць банкаў, якія маюць стопрацэнтны замежны капітал.

СМАЧНЫЯ ПРАДУКТЫ З ГЛЫБОКАГА

Залатых медалёў удастоены тры віды кансерваў Глыбоцкага малочнакансервавага камбіната.

Прадукцыя з Глыбокага была прадстаўлена на ўсерасійскай выставе прадуктаў харчавання і напіткаў "Распрадэкспа-2002". Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ і Камітэт грамадскіх і міжрэгіянальных сувязей урада Масквы запрасілі беларусаў прыняць удзел у выставе. Вынікам знаёмства масквічоў з глыбоцкай прадукцыяй сталі прапановы на пастаўку кансерваванага малака ў расійскую сталіцу.

У ВІЦЕБСКУ ПАСПЕЎ ВІНАГРАД

Самай цікавай і разнастайнай калекцыяй на рэспубліканскай выставе "Вінаград-2002", якая прайшла ў Мінску, прызнана экспазіцыя сям'і Віктара і Галіны Кухаравых з Віцебска, у якой больш за 70 сартоў вінаграду, многія гронкі важаць больш як 1,5 кілаграма.

НА ЗДЫМКУ: Віктар КУХАРАЎ з вырашчаным вінаградам.

ВІЛЬНЯ ЎШАНОЎВАЕ БЕЛАРУСКІХ ПЕСНЯРОЎ

У літоўскай сталіцы прайшоў Міжнародны фестываль беларускай песні, прысвечаны 120-гадоваму юбілею беларускіх песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Ён быў арганізаваны аб'яднаннем беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы і пасольствам Беларусі. На фестываль былі запрошаны дэлегацыі з нашай краіны, а таксама беларусы, якія жывуць у суседніх краінах — Латвіі, Эстоніі, Польшчы і Расіі. Віншавальныя пісьмы і тэлеграмы ў адрас удзельнікаў мерапрыемства накіравалі беларускія таварыствы Германіі, Вялікабрытаніі, Канады, ЗША, Чэхіі, Аўстраліі.

ЗНАЁМСТВА З КІТАЙСКАЙ КУЛЬТУРАЙ

"Кітайская акварэль" – так называецца выстава, якая адкрылася днямі ў рамках Дзён кітайскай культуры ў нашай краіне.

Мінчане і госці сталіцы на працягу месяца будуць мець магчымасць знаёміцца з творчасцю вядомых кітайскіх мастакоў у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

У ходзе Дзён кітайскай культуры з майстэрствам ансамбля правінцыі Цзянсі пазнаёмяцца жыхары Мінска і Барысава.

ЭПІДЭМІІ ГРЫПУ ПАКУЛЬ НЕ ЧАКАЕЦЦА

Пасля спякотнага лета нечакана халоднай для беларусаў стала першая палова восені.

Замест "бабінага" лета на мінулым тыдні ішлі дажджы са снегам, а тэмпература паветра знізілася да нулявой. А гэта значыць, што будзе павялічвацца і рост хвароб прастуднага характару.

Але эпідэмія грыпу беларусам пакуль не пагражае. Па прагнозах спецыялістаў Нацыянальнага цэнтра грыпу, яна чакаецца ў другой палове студзеня — пачатку лютага. Медыкі мяркуюць, што эпідэмія грыпу будзе "ўмеранай інтэнсіўнасці і змешанага характару". Гэта значыць, што адначасова будуць цыркуліраваць два субтыпы вірусу: А і В.

ЦЭЦ У КАЛІНІНГРАДЗЕ ПАБУДУЮЦЬ МІНЧАНЕ

Сталічнае ААТ "Белэнергабуд" выйграла тэндэр на заключэнне выгаднага кантракта на 70 мільёнаў долараў і хутка пачне ўзводзіць першую чаргу Калінінградскай ЦЭЦ-2.

Гэты аб'ект, які будзе адпавядаць усім сучасным патрабаванням з каэфіцыентам карыснага дзеяння 58 працэнтаў, плануецца пабудаваць за тры гады. Мінская будаўнічая кампанія — не навічок на расійскім рынку. Яе спецыялісты ўдзельнічалі ва ўзвядзенні Паўночна-Заходняй, Бурэйскай, Мутноўскай энергастанцый.

Падрыхтавала Ларыса ЛАЗАР.

візіт

НАЙБЛАЖЭННЕЙШЫ МІТРАПАЛІТ УЛАДЗІМІР Ў БЕЛАРУСІ

Прадстаяцель Украінскай Праваслаўнай Царквы Маскоўскага Патрыярхата Найблажэннейшы Уладзімір, Мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Украіны, па запрашэнні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі наведаў Беларусь з двухдзённым візітам.

Праграма візіту Высокага госця пачалася з ускладання кветак да абеліска на плошчы Перамогі ў беларускай сталіцы. Затым адбылася сустрэча кіраўніка Украінскай Праваслаўнай Царквы з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам. У час візіту Мітрапаліт Уладзімір наведаў храм Марыі-Магдаліны і саборы Свята-Духаў кафедральны і Пятра і Паўла, прыходы ў гонар Усіх Святых і іконы Божай Маці "Усіх тужлівых Радасць", Мінскае епархіяльнае ўпраўленне. Госць усклаў кветкі да помніка воінам-інтэрнацыяналістам у Траецкім прадмесці.

А ў час наведвання Найблажэннейшым Мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Украіны Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра і размешчаных у яго сценах Мінскай духоўнай акадэміі і семінарыі Яго Блажэнству быў уручаны дыплом ганаровага доктара Мінскай духоўнай акадэміі.

радавод

БАГАТАЯ СЯМ'Я

У сям'і віцяблян Веры і Васіля Самсонавых адзінаццаць дзяцей. Муж і жонка працуюць на станкабудаўнічым заводзе "Вістан".

Іх старэйшаму сыну Аляксею — 21 год, ён працуе на плодаагароднінным камбінаце. 19-гадовы Мікалай — прызыўнік, 17-гадовая Маша вучыцца ў вячэрняй школе № 4. Анатоль, Ілля, Валя, Наталля і Надзя — вучні сярэдняй школы № 45. Самыя маленькія Таня, Паша і Юля яшчэ дашкольнікі.

Дзеці любяць сваіх бацькоў і дапамагаюць ім ва ўсіх хатніх справах. Жывуць Самсонавы дружна, з любоўю адносяцца адзін да аднаго.

НА ЗДЫМКУ: сям'я САМСОНАВЫХ.

Фота Аляксандра Хітрова, БелТА.

ЧЫТАЙЦЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» Ў ІНТЭРНЭЦЕ!
http://golas.promedia.by

спорт

ТЭНІС

У МАКСІМА МІРНАГА — "КУБАК КРАМЛЯ"

У фінальным матчы разам са швейцарцам Ражэ Федэрэрам беларускі тэнісіст Максім Мірны перамог аўстралійскую пару і стаў уладальнікам "Кубка Крамля" ў парным разрадзе.

У сёлетнім сезоне гэта ўжо трэцяя перамога нашага суайчынніка і 13-я — за ўсю кар'еру. Паводле інфармацыі афіцыйнага інтэрнэт-сайта Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў, перамога ў Маскве прынесла М.Мірнаму 32 500 долараў ЗША. З пачатку года беларус зарабіў звыш 860 тысяч долараў.

ВЕЛАСПОРТ

НАТАЛЛЯ ЦЫЛІНСКАЯ НАБІРАЕ ХУТКАСЦЬ

Выдатнага выніку дабілася беларуская гоншчыца Наталля Цылінская на чэмпіянаце свету ў Капенгагене.

Наша спартсменка выйграла спрынт, а таксама была першай у гіце на 500 метраў. Такім чынам, беларуска паўтарыла свой вынік, якога дабілася два гады таму на чэмпіянаце свету ў Манчэстэры. Так трымаць!

НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС

УДАЛЫ СТАРТ

Беларуская зборная атрымала перамогу ў стартавым матчы розыгрышу Супердывізіёна Еўралігі. Наша каманда разграміла ў гасцях славачак — 3:0. На стартавым этапе нашы дзяўчаты сыгралі таксама з немкамі і зборнай Харватыі.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

актуальнае інтэрв'ю

БЕЛАРУСЫ РАСІІ ЗРАБІЛІ ЯШЧЭ АДЗІН КРОК У БУДУЧЫНЮ

Як мы паведамлялі, у кастрычніку ў канферэнц-зале маскоўскай мэрыі адбыўся II з'езд Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі". У складзе афіцыйнай дэлегацыі ад Рэспублікі Беларусь на з'ездзе прысутнічаў намеснік старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір ЛАМЕКА. Пасля вяртання з Масквы ён даў інтэрв'ю карэспандэнту нашай газеты.

— Уладзімір Барысавіч, беларуская дыяспара ў Расіі самая вялікая. Як адбываецца развіццё Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі"?

— У Расіі пражываюць каля двух мільёнаў беларусаў. Гэта прыкладна шостая частка ўсіх беларусаў у свеце. Таму з'езду надавалася вялікая ўвага як з боку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, так і нашага ўрада: дэлегацыю на з'езд ад Рэспублікі Беларусь узначаліў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Дражын. У склад дэлегацыі ўвайшлі міністр культуры Леанід Гуляка, міністр інфармацыі Міхаіл Падгайны. Гасцямі з'езда былі начальнік аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцей Мінгарвыканкама Ала Рабіцава і вядомы беларускі кампазітар Ігар Лучанок. На з'езд запрасілі таксама прадстаўнікоў беларускіх грамадскіх арганізацый.

Уладзімір Дражын зачытаў прывітанне з'езду ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і выступіў з грунтоўнай прамовай, у якой акрэсліў прыярытэты нашай дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да беларускіх дыяспар Расіі і памежных дзяржаў. Леанід Гуляка паведаміў аб развіцці нацыянальна-культурных традыцый у Рэспубліцы Беларусь і напрамках супрацоўніцтва з беларусамі замежжа. Я ад імя Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей таксама вітаў з'езд як значную з'яву ў жыцці беларусаў Расіі. Прыкладна 30 асобам — кіраўнікам і актывістам грамадскіх аб'яднанняў беларусаў у Расійскай Федэрацыі былі ўручаны ўзнагароды, Ганаровыя граматы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь за ўмацаванне аўтарытэту Рэспублікі Беларусь за мяжой і пашырэнне сяброўскіх сувязей паміж народамі Беларусі і Расіі.

— Я чуў, што ад камітэта з'езду быў уручаны падарунак — выява Ефрасінні Полацкай...

— Так. На заканчэнне з'езда мы перадалі землякам такую выяву, вытканую на дыване. Людзі вельмі прачула віталі гэта, бо святая Ефрасіння Полацкая — вялікая асветніца і гуманістка, ахоўніца ўсяго ўсходнеславянскага свету. Крыжом, які яна трымае ў руках, сімвалічна былі асвячоны ўсе дэлегаты з'езда.

— Якія вашы асабістыя ўражанні ад з'езда?

— Асабліва ўразіла зацікаўленасць нашых землякоў у дзейнасці федэральнай і рэгіянальных аўтаномій. Уявіце: яны прыехалі на з'езд з розных мясцін Расіі: Краснаярска, Петрапаўлаўска-Камчацкага, Цюмені, Далёкага Усходу, адкуль аднаго лёту да Масквы 5–7 гадзін, а білет каштуе немалыя грошы. Але людзі радаваліся магчымасці сустрэцца і абмеркаваць свае праблемы. Амаль кожны з дэлегатаў імкнуўся пагаварыць з гасцямі з Беларусі. Выказваліся пажаданні, каб стасункі з Радзімай пашыраліся, паглыбляліся, і мы запэўнілі, што будзем імкнуцца нейкім чынам спатоліць іх настальгію і тугу па Радзіме.

Увогуле, засталіся прыемныя ўражанні. З'езд быў добра падрыхтаваны. Прысутнічала 88 дэлегатаў, а гасцей было больш за 300 чалавек. Прагучала шмат цікавых выступленняў. Людзей хвалюе лёс Расійскай Федэрацыі, бо яны там жывуць, і лёс нашай дзяржавы, роднай мовы і нацыянальнай культуры, бо яны беларусы па паходжанні. Хвалюе і далейшы лёс Саюза, да якога імкнуцца нашы народы. Цікавяць стасункі нашых дзяржаў, асабліва эканамічныя, што сёння вельмі важна.

— Якая пазіцыя беларускай дыяспары Расіі ў адносінах да Саюза Беларусі і Расіі?..

— Безумоўна, гэтае пытанне ўздымалася на з'ездзе. Яго ўдзельнікі выказваліся за Саюз, але на аснове абсалютна роўных правоў для дзвюх дзяржаў, з умовай захавання і развіцця культурнай традыцыі і мовы як паказчыка нашай нацыянальнай адметнасці. Аб гэтым выказаўся старшыня Іркуцкай беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Алег Рудакоў. Былі слушныя прапановы і заўвагі да расійскіх улад. Дэлегатаў хвалявала, каб не асімілявалася не толькі беларуская культура, а наогул культуры людзей іншых нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі Расіі. Шмат было пытанняў і да нашай дэлегацыі. Мы ўсё занатавалі, каб улічыць выказаныя пажаданні.

— Каб не асімілявалася беларуская дыяспара, у многім залежыць і ад дзеянняў нашай дзяржавы. Ці ішла размова на з'ездзе аб распрацоўцы Закона Рэспублікі Беларусь "Аб суайчынніках за мяжой", які ініцыіраваны Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей?

— Зараз законапраект знаходзіцца на дапрацоўцы, і мы адкрытыя для ўсіх, хто жадае яго ўдасканаліць і дашле свае прапановы ў камітэт. Дарэчы, у сваім дакладзе намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Дражын якраз засяродзіў увагу на гэтым законе. Сказаў, што наша дзяржава зацікаўлена як мага хутчэй мець гэты закон у дасканалым выглядзе.

Яшчэ абнадзейвае тое, што ў нас ёсць Дзяржаўная праграма "Беларусы ў свеце". Праўда, яна апошнім часам не мела фінансавання ў сувязі са складаным эканамічным становішчам у Беларусі. Але вось гэты з'езд ўвачавідкі нам паказаў, наколькі важна, каб гэта праграма мела фінансавую падтрымку. Трэба рабіць усё магчымае, і камітэт, апіраючыся на падтрымку зацікаўленых бакоў, зноў будзе ўносіць абноўленую праграму на разгляд урада.

Беларусы ў Расіі разумеюць нашы эканамічныя складанасці і не крыўдзяцца. Мы ўсе адчуваем, што сёння трэба актыўна ісці ў рынак, кожнаму неабходна вучыцца быць гаспадаром на сваім працоўным месцы і на той зямлі, дзе жыве. Нездарма ў многіх выступленнях адзначалася, што беларуская дыяспара з'яўляецца адным з механізмаў для павелічэння таварабмену паміж Беларуссю і Расіяй і развіцця іншых узаемавыгадных эканамічных адносін. Ручайкі гэтых спраў будуць сцякацца ў адзінае, і тады будзе лягчэй вырашаць фінансавыя пытанні.

— Па сваіх службовых абавязках вы часта сустракаецеся з прадстаўнікамі беларускіх дыяспар розных краін. Які яе характар у Расіі? Вы рабілі такія параўнанні?

— Мне здаецца, што наш менталітэт, тэлерантнасць, памяркоўнасць — характэрныя для ўсіх беларусаў, дзе б яны ні былі, што дапамагае прыстасавацца да новага асяродка. І праявы прыналежнасці да беларускай нацыі ёсць у многіх. Прыкметнай з'явай на з'ездзе (і аб гэтым казалі многія дэлегаты) былі беларускамоўныя выступленні нашай дэлегацыі. Ды і самі ўдзельнікі імкнуліся размаўляць з намі і паміж сабой па-беларуску. Некалі гэтаму не прыдавалася вялікага значэння, але зараз, калі Беларусь стала суверэннай дзяржавай, валоданне беларускай мовай — яскравы паказчык нацыянальнай прыналежнасці.

Беларуская дыяспара ў Расіі — адна з самых паважаных. Нашы беларусы там годна сябе адчуваюць, бо сапраўды ёсць чым ганарыцца. Вось і на з'ездзе яны гаварылі пра свае дасягненні. Гэта адчувальны ўклад у нашу нацыянальную спадчыну і культуру. Адзінае, што можна было б ім пажадаць, — гэта больш скіроўваць свае погляды сюды, на сваю этнічную радзіму, дапамагаць нам уваходзіць актыўней у рынак, ствараць сумесныя прадпрыемствы. Вопыт расійскія беларусы маюць. Да прыкладу, можна нагадаць Калінінградскую вобласць, дзе больш за 60 працэнтаў працаўнікоў рыбалавецкага флоту складаюць беларусы. Сёння без эканамічных зносін гаварыць пра духоўныя не выпадае. Такі час.

— Ці значыць гэта, што фестываль творчасці замежных беларускіх суполак, пра які многія мараць, правесці ў Беларусі праблематычна?

— Такі фестываль можа быць рэальным. Паглядзіце, якое цудоўнае свята нацыянальных культур адбываецца ў Гродне! А калі мы арганізуем фестываль замежных беларускіх суполак, ён будзе не горшы, бо паказаць ёсць што. Я ў гэтым пераканаўся на ўрачыстым канцэрце, які нам паказалі пасля з'езда. Назаву толькі гурт "Сябры" з Башкартастана. Мы былі ў захапленні ад высокага мастацтва. "Сябры" прадэманстравалі выдатную захаванасць беларускага слова і песні, быццам удзельнікі гурта ніколі не пакідалі Беларусь! Наша задача — гуртаваць беларускія таленты. Але на такую справу патрэбны немалыя грошы. Значыць, трэба вяртацца да праграмы "Беларусы ў свеце". Праз год ці два, магчыма, мара і спраўдзіцца.

На пачатку XXI стагоддзя і трэцяга тысячагоддзя ўмацоўваецца разуменне, што беларускай нацыі трэба згуртоўвацца. Разуменне гэтага шырыцца як у нашым грамадстве, так і ў беларускай дыяспары. Менавіта ў гэтым пераканаў II з'езд беларусаў Расіі.

Гутарыў **Віктар МАЦЮШЭНКА.**

ДАВЕДКА: Грамадскае аб'яднанне "Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія "Беларусы Расіі" створана ў красавіку 1999 года. Аб'ядноўвае 11 беларускіх суполак. Супрацоўнічае з іншымі нацыянальна-культурнымі аўтаноміямі Расіі, федэральнымі ўладамі, з Дзяржаўнай думай, з Адміністрацыяй Прэзідэнта Расіі, іншымі дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі і арганізацыямі.

На II з'ездзе ФНКА "Беларусы Расіі" старшынёй савета паўторна абраны Францішак Каўрыга.

перспектывы

ЗДАБЫТЧЫКІ ЧОРНАГА ЗОЛАТА

За апошнія пяць гадоў беларускія нафтавікі дабіліся найвышэйшага выніку: за 9 месяцаў бягучага года здабыта больш за 130 тысяч тон нафты. Поспеху спрыяла ўдасканаленне тэхналогіі здабычы — бурэнне другіх ствалоў на нафтавай свідравіне.

Беларускія нафтавікі сёння вядуць здабычу нафты на 50 радовішчах з 584 свідравін.

НА ЗДЫМКУ: брыгада буравога майстра Васіля КРЫПАКА (другі злева) у складзе Анатоля ДАНІЛЕНКІ, Дзмітрыя ЛІПСКАГА, Васіля ФЛЯРКО і Мікалая МІНЧЫКА.

у парламенце

ВОСЕНЬСКІ МАРАФОН

На пачатку кастрычніка пачала работу чарговая — пятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Яна працягнецца да канца года, і за гэты час дэпутатам трэба разгледзець каля 100 законапраектаў у найважнейшых сферах развіцця дзяржавы і грамадства.

Як лічыць спікер палаты Вадзім Папоў, "неабходна не проста прыняцце праектаў законаў, але паслядоўнае фарміраванне нацыянальнай заканадаўчай сістэмы, арыентаванай на вырашэнне стратэгічных задач, адзінай па сваіх мэтах і несупярэчлівай па змесце".

Адным з галоўных дакументаў, што павінны абмеркаваць дэпутаты, з'яўляецца праект закона аб бюджэце на 2003 год. Па словах Вадзіма Папова, падрыхтоўчая работа над ім пачалася яшчэ ў сакавіку. Праект асноўных напрамкаў бюджэтна-падатковай палітыкі разглядаўся на пасяджэнні парламенцкай камісіі з удзелам міністра фінансаў Мікалая Корбута. Дэпутаты далі станоўчую адзнаку тым канцэптуальным напрамкам праекта, што тычацца адзіных падыходаў утрымання мясцовых падаткаў і збораў, устанаўлення мараторыя на ўвядзенне на працягу бюджэтнага года новых падаткаў і плацяжоў, а таксама змянення ставак. Падтрымана парламентарыямі і запланаванае ўрадам павелічэнне сярэдняй заработнай платы бюджэтнікаў да 125 долараў ЗША.

Разам з тым многія дэпутаты даволі рэзка крытыкуюць тыя раздзелы праекта, што тычацца недастатковага фінансавання мер па ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, аграпрамысловага комплексу, аховы здароўя, культуры, адукацыі. Таму ўрад быў вымушаны прыслухацца да доказаў прадстаўнікоў заканадаўчай галіны ўлады і пагадзіцца з шэрагам прапаноў. У прыватнасці, прадугледжана захаванне на ранейшым узроўні адлічэнняў у Рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, збораў у мясцовыя мэтавыя бюджэты, надзвычайнага падатку і г.д. Улічаны таксама прапановы дэпутатаў, каб насельніцтва пакрывала 50 працэнтаў выдаткаў на жыллёва-камунальныя паслугі, у той час, калі ўрад імкнуўся павялічыць гэту лічбу да 60 працэнтаў. Дзякуючы ўмяшанню заканадаўцаў, у наступным годзе павінна павялічыцца і фінансавая падтрымка прамысловасці.

"У час абмеркавання праекта бюджэту ў Палаце прадстаўнікоў, — лічыць Вадзім Папоў, — нам прадбачыцца канструктыўная праца з урадам. Зразумела, што пры фарміраванні бюджэту ўрад вымушаны ўлічваць рэаліі нашай эканомікі. Мы, у сваю чаргу, зацікаўлены ў тым, каб параметры бюджэту забяспечвалі нармальную жыццядзейнасць краіны".

На пятай сесіі дэпутацкі корпус працягне работу па кадыфікацыі нацыянальнага заканадаўства, што распачалі некалькі гадоў таму. У іх ліку — Падатковы кодэкс, якога даўно чакаюць не толькі суб'екты гаспадарання, але і ўся фінансава-крэдытная сістэма дзяржавы. Вясной палата прыняла Агульную частку гэтага дакумента, але Савет Рэспублікі яе адхіліў, паколькі ў сенатараў з'явіліся свае заўвагі. Усімі гэтымі спрэчнымі пытаннямі зараз займаецца пагаджальная камісія, куды ўвайшлі прадстаўнікі абедзвюх палат. З адзінаццаці заўваг, якія ўнеслі сенатары, сем ужо ўзгоднены, а па астатніх выпрацоўваецца новая рэдакцыя, што дазволіць максімальна зблізіць пазіцыі бакоў.

У парадак дня восеньскай сесіі ўнесены таксама праект Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях, новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса і шэраг іншых важных дакументаў.

Па словах спікера, у бліжэйшыя месяцы дэпутаты прымуць таксама ўдзел у шэрагу міжнародных мерапрыемстваў, каб давесці да ведама замежных калег больш дакладную інфармацыю пра Беларусь, праінфармаваць іх аб знешнепалітычным курсе дзяржавы, накіраваным на ўзаемакарыснае супрацоўніцтва з усімі краінамі свету, міжнароднымі парламенцкімі структурамі, урадавымі і няўрадавымі арганізацыямі.

Зусім нядаўна дэлегацыя Нацыянальнага сходу Беларусі прыняла ўдзел у рабоце 171-й сесіі Савета Міжпарламенцкага Саюза, якая адбылася ў Жэневе. "Сустрэчы з дэлегацыямі іншых краін паказалі разуменне замежнымі парламентарыямі праблем будаўніцтва Саюзнай дзяржавы і пытання аб аднаўленні статуса Нацыянальнага сходу Беларусі ў Парламенцкай Асамблеі АБСЕ і ў Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы. Наш дыялог з гэтымі структурамі працягваецца", — адзначыў Вадзім Папоў.

Ларыса ЛАЗАР

з прэс-канферэнцыі

ЦІ ЗДОЛЬНЫЯ АЙЧЫННЫЯ ФАРМАЦЭЎТЫ ЗАДАВОЛІЦЬ ХВОРЫХ?

Выстава "Медыцына 2002", якая прайшла ў Мінску, стала падставай для абмеркавання праблем у гэтай сферы. Пытанні забеспячэння насельніцтва якаснымі і даступнымі па цане лекамі вызначылі тэму прэс-канферэнцыі, арганізаванай непасрэдна на выставе.

Ліцэнзію на вытворчасць медыкаментаў на Беларусі маюць 28 суб'ектаў гаспадарання розных відаў уласнасці. Працуюць 2 сумесныя прадпрыемствы, 10 з недзяржаўнай формай уласнасці. У галіне занята больш як 5 тысяч чалавек. Галоўным дасягненнем фармацэўтычнага рынку Беларусі, па словах **Вячаслава Драніцы**, генеральнага дырэктара канцэрна "Белбіяфарм", з'яўляецца адсутнасць на ім падробак медпрэпаратаў. У гэтым яго адрозненне ад расійскага і ўкраінскага, да прыкладу.

Хоць існуе вялікая колькасць лякарстваў (каля 2,5 тысячы), аднак ёсць спіс асноўных, які ўключае 175 найменняў. Айчынная прамысловасць выпускае 103 назвы лекаў з гэтага спіса. Большасць прэпаратаў, што прадаюцца ў нашых аптэках, — імпартныя. Унутраныя пастаўкі складаюць толькі 30 працэнтаў. Штогод іх колькасць расце.

Галоўная прычына, з-за якой ёсць неабходнасць імпартазамяшчэння і павелічэння колькасці айчынных прэпаратаў, — жаданне зрабіць лякарствы больш даступнымі па цане. Безумоўна, не ставіцца задача запоўніць айчыннымі медпрэпаратамі ўвесь рынак. Гэта немэтазгодна з эканамічнага пункту гледжання. Буйныя прадпрыемствы ў Югаславіі, да прыкладу, першапачаткова разлічаны на экспарт: у краіне застаецца толькі 10 працэнтаў ад выробленых медпрэпаратаў, астатняе прадаецца за мяжу. Такім буйным вытворцам немагчыма саставіць канкурэнцыю.

Дарэчы, існуюць вытворчасці анкалагічных лекаў, якія працуюць усяго толькі 2-3 месяцы ў год. У Чэхіі — гэта вялізны корпус з сучасным дарагім абсталяваннем. Будаваць нешта падобнае на Беларусі не варта — такое меркаванне спецыялістаў. Тым не менш праграма імпартазамяшчэння дазволіла зэканоміць у гэтым годзе 500 тысяч долараў ЗША. Многія беларускія прадпрыемствы выпускаюць джанерыкавыя формы, гэта значыць, аналагі імпартных. Іх распрацоўка, у адрозненне ад арыгінальных, займае не 9 гадоў, а каля двух і з'яўляецца больш таннай.

Вытворчасць лекаў — не толькі адна з самых сацыяльна значных, але і вельмі дарагая галіна прамысловасці. Толькі летась кошт фармацэўтычных праектаў склаў 1 мільярд 74 мільёны рублёў. Асноўныя сродкі выдаткоўваюцца на распрацоўку арыгінальных лякарстваў. У адкрытага акцыянернага таварыства "Белмедпрэпараты", якое працуе з 1929 года, ёсць ноў-хаў. Гэта заменнікі крыві, а таксама прэпарат, які добра зарэкамендаваў сябе ў фототэрапіі пры лячэнні ракавых пухлін, — **фаталон**. Ён не мае фототаксічнага ўздзеяння, лечыць рак губы, скуры, малочных залоз. Нягледзячы на станоўчыя водгукі беларускіх анколагаў і іх расійскіх калег, прэпарат у практыцы не распаўсюджаны так шырока, як хацелася б. Кіраўніцтва "Медпрэпаратаў" накіравала ўжо не адзін ліст у Міністэрства аховы здароўя, каб там паспрыялі заказу фаталону беларускімі клінікамі. Пакуль адказу ад міністэрства няма, і ў анкалагічнай клініцы ў Бараўлянах фаталон шырока не прымяняецца.

Ужо ёсць у продажы прэпарат **касалін**, які названы "беларускай віаграй. Але, па сцвярджэнні вядучага фармаколага "Белмедпрэпаратаў" Алены Краўчанка, касалін у адрозненне ад віагры не "робіць мужчыну халіфам толькі на гадзіну", а дапамагае значна і надоўга палепшыць мужчынскае здароўе шляхам плаўнага павышэння гармону тэстастэрону ў крыві. Атрымліваюць касалін з бабровага струменю.

На Барысаўскім заводзе медпрэпаратаў ёсць таксама шэраг цікавых распрацовак. Адна з іх — прэпарат **нітраміл**, што выкарыстоўваецца ў лячэнні хворых на стэнакардыю, на ішэмічныя парушэнні кровазвароту ў канечнасцях.

Адна з вялікіх праблем фармацэўтычнай галіны — запазычанасць спажыўцоў за пастаўленыя медыкаменты. На пачатак верасня яна склала 4,08 мільярда рублёў, з якіх пратэрмінавана амаль палова.

Генеральны дырэктар сумеснага беларуска-галандскага прадпрыемства "Фармлэнд" **Іван Лагавы** сцвярджае, што праца на рынку ўскладняецца невялікай плацежаздольнасцю і пасрэднікаў, і спажыўцоў. Абарот сродкаў складае каля 3-х месяцаў. Калі грошы ўсё ж прыходзяць, гэта ўжо, так бы мовіць, не тыя грошы.

Умовы рынку дыктуюць неабходнасць прыняцця шэрага захадаў, якія адпавядаюць сучаснасці. Яшчэ паўгода таму айчынныя вытворцы, да прыкладу, не ўдзельнічалі ў фармацэўтычных тэндэрах. Цяпер жа не толькі бяруць удзел, але і выйграюць.

Тым не менш беларускім прэпаратам, нягледзячы на іх даступны кошт, даволі цяжка канкурыраваць з замежнымі. Першая прычына — недастатковае рэкламаванне айчынных лекаў. Існуе адзіная эканамічная прастора паміж Беларуссю і Расіяй. Расійскія вытворцы маюць роўныя правы з нашымі. У выніку ў аптэках медпрэпараты расійскіх фірм маюцца ледзь не ў большай колькасці, чым айчынныя. А ў той жа Расіі існуе заканадаўчы акт, які дазваляе імпартаваць у краіну медпрэпараты за кошт бюджэту толькі ў выпадку, калі яны ці іх аналагі не вырабляюцца на тэрыторыі Расіі.

На Беларусі працуе каля тысячы недзяржаўных аптэк і кіёскаў па продажы медыкаментаў. Паколькі гандлёвая надбаўка на лякарствы айчыннай вытворчасці складае 10 працэнтаў, а на імпартныя — 20 працэнтаў, гандляваць замежнай прадукцыяй больш выгадна.

У нашай краіне дасюль няма закона аб лекавых сродках, сваёй фармацэўтычнай інспекцыі. Цяпер гэта вельмі актуальна, бо, каб быць паўнапраўным удзельнікам сусветнага фармацэўтычнага рынку, трэба адпавядаць яго ўмовам. Ва ўсім свеце сур'ёзныя фармацэўтычныя фірмы імкнуцца, каб іх вытворчы цыкл меў міжнародны сертыфікат GMP (належная вытворчая практыка). Дарэчы, Расія ўжо заявіла, што з 2005 года пераходзіць на сістэму GMP.

Калі такое здарыцца, рынак гэтай краіны будзе закрыты для беларускіх прэпаратаў. А з ім і рынкі Заходняй Еўропы і Прыбалтыкі. GMP — сістэма праходжання дакументацыі, якая адлюстроўвае празрыстасць вытворчага працэсу і адпаведнасць кожнага яго цыкла тэхналогіі. Пераход на GMP каштуе вельмі дорага, бо звязаны з мадэрнізацыяй абсталявання. Каб перавесці на GMP, да прыкладу, Барысаўскі завод медпрэпаратаў, неабходна каля 20 мільёнаў долараў ЗША. Відавочна, што без сур'ёзных інвестыцый тут не абысціся.

Алена СПАСЮК.

тэндэнцыя



Фота БелТА.

ПРАГРАМА «КАРДЫЯЛОГІЯ»

На базе Віцебскага абласнога тэрытарыяльнага аб'яднання "Кардыялогія" адкрыта першае ў рэспубліцы аддзяленне рэфрактарнай артэрыяльнай гіпертызацыі на 20 ложкаў, у якім будуць лячыць хворых на артэрыяльную гіпертэнзію (гіпертанію). Такім чынам віцяблянне першымі ў краіне выканалі адно з прадпісанняў рэспубліканскай праграмы "Кардыялогія".

НА ЗДЫМКУ: доктар медыцынскіх навук, прафесар Уладзімір ЛАЛІНІ і ўрач вышэйшай катэгорыі Людміла АНДРАЛАВА аглядаюць пацыента.

дыпкур'ер

УДЗЕЛ У ВЫСТАВЕ "ПРАДПРЫМАЛЬНІК ЛАТГАЛІІ 2002"

У кастрычніку ў горадзе Рэзекне (Латвія) праводзілася традыцыйная рэгіянальная выстава "Прадпрымальнік Латгаліі 2002".

Яна была арганізавана Латвійскай гандлёва-прамысловай палатай, Саветам прадпрымальнікаў Латгаліі і Рэзекненскай гарадской думай. У падрыхтоўцы і адкрыцці выставы прымалі ўдзел прадстаўнікі Віцебскай гандлёва-прамысловай палаты і Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Даўгаўпілсе.

На выставе была прадстаўлена прадукцыя віцебскіх прадпрыемстваў ААТ "КІМ", ААТ "Віцебскія дываны", РУВП "Віцязь" і іншых. Экспазіцыя беларускіх вытворцаў выклікала вялікую цікавасць у наведвальнікаў выставы.

ПОЛЬСКІЯ ВЕТЭРАНЫ Ў ПАСЁЛКУ ЛЕНІНА

11-13 кастрычніка ў мерапрыемствах, прысвечаных 59-й гадавіне бітвы каля пасёлка Леніна, што ў Магілёўскай вобласці, традыцыйна прыняла ўдзел дэлегацыя польскай грамадскасці.

У складзе дэлегацыі — ветэраны Першай польскай дывізіі пяхоты імя Т.Касцюшкі, прадстаўнікі іншых ветэранскіх арганізацый Польшчы, харцары, усяго каля 80 чалавек.

На сустрэчы прысутнічалі беларускія і расійскія ветэраны, ваеннаслужачыя, школьнікі. Арганізатар мерапрыемстваў — Магілёўскі аблвыканкам.

ДЭЛЕГАЦЫЯ МНС У ЛІТВЕ

Дэлегацыя Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь на чале з першым намеснікам міністра па надзвычайных сітуацыях Энверам Барыевым наведала ў кастрычніку Літоўскую Рэспубліку.

У Вільнюсе адбыліся перамовы па праекце Дагавора паміж урадамі Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў сферы прадухілення катастроф, стыхійных бедстваў і буйных аварый, а таксама ліквідацыі іх наступстваў.

Па выніках перагавораў быў падпісаны пратакол, згодна з якім дэлегацыі працягваюць кансультацыі па праекце дагавора, які будзе ў значнай ступені садзейнічаць развіццю супрацоўніцтва ў данай сферы. Бакі заявілі, што бачаць шырокія магчымасці супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў у сферы прадухілення катастроф, стыхійных бедстваў і буйных аварый, а таксама ліквідацыі іх наступстваў.

СУСТРЭЧА Ў АБУ-ДАБІ

Адбылася сустрэча Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах Уладзіміра Сулімскага з генеральным дырэктарам Фонду развіцця Абу-Дабі Саідам Халфанам Матарам Аль Румаіці.

Асноўная ўвага ў час гутаркі была звернута на рэалізацыю дамоўленасцей аб супрацоўніцтве з фондам, дасягнутых па выніках візіту дзяржаўнай дэлегацыі на чале з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкам у ААЭ ў сакавіку 2000 года, а таксама пытанням далейшага замацавання партнёрскіх сувязей.

Прэс-служба МЗС.

сітуацыя

ВІЗАВЫ БАР'ЕР

У канцы верасня Міністэрства замежных спраў Літвы заявіла аб дэнансацыі міжурадавага пагаднення з Беларуссю аб бязвізавых паездках асобных катэгорый грамадзян, што дзейнічала паміж нашымі краінамі апошнія дзесяць гадоў.

Гэты крок не стаў нечаканасцю для беларускага боку, бо размовы аб узмацненні візавага рэжыму дзяржавамі — кандыдатамі на ўступленне ў ЕС вядуцца ўжо даўно. Тым не менш, тая паспешлівасць, з якой Літва пачала ўзводзіць шчыльную агароджу са сваім суседам, у Мінску ўспрынята даволі негатыўна. Як вядома, Беларусь настойвае на захаванні бязвізавага рэжыму для жыхароў памежных раёнаў дзвюх краін, грамадзян, старэйшых за 60 гадоў, і аўтаперавозчыкаў, якія да гэтага часу мелі візавыя льготы. Літоўцы некалькі разоў мянялі сваю пазіцыю, але ў рэшце рэшт на кампраміс так і не пайшлі.

Па словах намесніка міністра замежных спраў Беларусі Аляксандра Герасіменкі, гэта рашэнне ідзе ў разрэз з прынцыпамі добрасуседства і супярэчыць асноўным дакументам АБСЕ па спрошчванні парадку перасячэння межаў. Да таго ж уступленне ў Еўрапейскі Саюз зусім не азначае аўтаматычнага ўзмацнення візавага рэжыму краіны. Гэта патрабаванне закладзена Шэнгенскім пагадненнем, далучэнне да якога — вельмі складаная працэдура. Перспектыва ж далучэння Літвы да гэтага пагаднення яшчэ нават не вызначана.

Таму паміж дзвюма гэтымі падзеямі, лічыць Аляксандр Герасіменка, пройдзе шмат часу, і многае можа змяніцца. Хто ведае, магчыма, праз некалькі гадоў на ўсёй еўрапейскай тэрыторыі будзе створана адзіная прастора...

"Спяшацца сёння з увядзеннем такіх поўнамаштабных візавых адносін не трэба, — гаворыць намеснік кіраўніка знешнепалітычнага ведамства. — Бо гэта тычыцца перш за ўсё людзей сталага ўзросту, якія недастаткова сацыяльна абаронены, а таксама памежнага насельніцтва, якое мае родных у суседняй краіне. Улічваючы гэтыя фактары, Літва цалкам магла б захаваць дзеючыя ўмовы перасячэння мяжы". Па яго словах, МЗС Беларусі настойвае на сваёй пазіцыі і робіць усё неабходнае, каб дыялог па гэтым пытанні паміж Мінскам і Вільнюсам быў працягнуты.

Ларыса ЛАЗАР.

да 120-годдзя песняроў

СУСТРЭЧА Ў СМОЛЬНІ

Фактычна "Наша ніва" на сваіх старонках пазнаёміла завочна двух творцаў, сялянскіх паэтаў. Рэдактар Аляксандр Уласаў прыхільна ставіўся да іх абодвух. Янку Купалу ён ведаў больш, бо сам жыў недалёка ад Вязынкі, каля ваколіц мястэчка Радашковічы, дзе Іван Луцэвіч працаваў памочнікам пісара ў судзе, а пасля і хатнім "дарэктарам". Яго духоўным настаўнікам быў Ядвігін Ш., які працаваў аптэкарам у мястэчку, і ў час гутарак пра тых беларусаў, што ахвярна служылі Бацькаўшчыне, не раз прыгадвалася імя творцы з Мікалаеўшчыны. Жонка Браніслава Тарашкевіча, Вера Андрэеўна ўспамінала: "Дзядзька Саша паспрыяў, каб Купала і Колас спаткаліся, магчыма, падказаў аўтару "Паўлінкі" першым зрабіць крок, бо ваш дзядзька пасля астрогу быў пад наглядам..."

І сустрэча адбылася. З цягніка ў Стоўбцах Янка Купала накіраваўся ў Мікалаеўшчыну да Кастуся Міцкевіча берагам Нёмана. Замест дзесяці вёрст ён прамераў пехатою цэлых пятнаццаць. Крочыў з сукаватым кіем малады Купала, натхняўся маляўнічымі мясцінамі, якія добра запомніў з твораў "мікалаеўца".

Першае, што ўбачыў паэт, падыходзячы да хутара, дык гэта "журавель" з драўляным вядром над студняю. Хата, крытая дранкаю, на дзве палавіны, гумно з буслінным гняздом на саламяным даху, склеп пры самым лесе, за хатаю. На двары гуляла з пяском дзяўчынка з чорнымі вачыма і тонкімі косамі на цёмна-русай галаве, а за гумном пасвіўся сівы конь на лужку. Каля калодзежа сядзеў пажылы чалавек, кляпаў касу. "Мусіць, дзядзька Антось", — мільганула згадка.

Хвілін колькі паэты прыглядаліся, нібы не верачы гэтай несподзяванай сустрэчы. Абодва крыху хваляваліся... Першым парушыў маўчанне шляхетны, далікатны госць. Ён не звяртаў увагі на сялянскі строй, у якім быў былы вязень астрога. Гэтая бедная сялянская хата, босыя ногі яшчэ больш прываблівалі.

— Ну што, Кастусь, добры дзень у тваю хату. Прызнаў нечаканага госця?

— Янка! Каб жа ты сказіўся, мой жаданы і дарагі госць. Чаму ж, Купалка, не папярэдзіў, я б хоць нейкі марафет навёў...

Ён шырока раскінуў рукі, яны абняліся, нібы параднёныя сябры пасля доўгай разлукі...

Маці Ганна выйшла з хаты, прыветна ўсміхалася. Яна паспела завязаць светлы фартух, хустку новую ў чорныя матылькі. Сын не паспеў прадставіць сваю маці, як інтэлігентны, выхаваны госць пацалаваў руку жанчыне.

— Вы і будзеце цётка Ганна? Я такою ўяўляў вас, пані Міцкевіч.

— Дык заходзьце ў хату, дарагі госць. Я ўжо здагадалася, хто вы. Мой Кастусь не раз успамінаў, ганарыўся, што ёсць беларус, заступнік мужыцкай долі... Заходзьце, заходзьце — і адразу на кут пад абразы, там ваша месца...

Калі ўжо затрашчалі скваркі на патэльні, прыйшлася да месца чарка, заявіўся і дзядзька Антось, павітаўся з госцем чынна. Перахрысціўшы лоб і грудзі, прысеў.

Маці радавалася за сына, што ён павесялеў, вочы пасвятлелі, заіскрыліся агеньчыкамі. Потым нечакана падняўся. На румяным, курносым твары бегалі гарэзлівыя смяшынкі.

— Пакуль, хлопцы, не сцямнела, сіганём у лясок... Тут, у бок Альбуці, я нагледзеў ліпу-прыгажуню. Такую стройную, гнуткую, як тая царэўна ў Пушкіна. Дык пасадзім дрэва разам, каб не забыцца пра сустрэчу тут, у Смольні. Янка Купала пагадзіўся:

— Ліпа, Кастусь, добрая дзея. Дай жа, Божа, дачакацца той пары, калі яна ўзнімецца да аблокаў, зашуміць купчастаю чупрынай, а мы пасядзім пад яе шатамі...

— Абавязкова, Янка. Дрэва — наша памяць, няхай пераплятаецца каранямі і ў сэрцы будзе з намі....

* * *

У 1947 годзе годзе Ігнат Міцкевіч і Якуб Колас сядзелі на лаўцы пад шырокімі шатамі ліпы. Зялёнае густое дрэва прыбралася ў залацістую квецень. Над галовамі гулі пчолы, стаяў ціхі, спякотны дзень. За кавалкам скошанай сенажаці праменіў люстэркам на сонцы плыткі Нёман. Дзядзька Юзік выйшаў з хаты, паставіў на самаробны стол пляшку жандовай, сялянскую кілбасу, вяндліну, патэльню з падсмажанымі яйкамі.

— Дарэмна ты, Юзік, турбуешся. Няма спасу ад спякоты, гарэлка нам пашкодзіць, — не зусім упэўнена мовіў Ігнат Міцкевіч.

— Каму гарэлка шкодзіць, той у госці не ходзіць, — Якуб Колас узняў лысую галаву, акінуў вачыма кучаравую ліпу. — Тэк! І вымахала дрэва, з небам гаворыць. Карані моцна ўраслі ў зямлю, перапляліся... Не дачакаліся Янка і дзядзька Антось, каб пасядзець усім гуртам у цяньку... Ну дык за іх памяць вып'ем чарку стоячы.

Сымон БЕЛЫ (Колас).

жыццёвыя сюжэты

АНДРЭЙ ЯЎТАШУК ДОРЫЦЬ ЛЮДЗЯМ СВЯТА

У старажытным горадзе Камянцы Брэсцкага раёна жыве малады чалавек, праца якога накіравана на тое, каб святочныя дні адрозніваліся ад манатонных шэрых працоўных будняў, каб больш людзей усміхалася.

Андрэй Яўташук са школьных гадоў выступаў на сцэне, любіў расказваць розныя гумарэскі, каб насмяшыць гледачоў, і марыў звязаць жыццё з тэатрам, нават хацеў ехаць у Маскву паступаць у знакамітую расійскую тэатральную навучальную ўстанову. Але, паразважаўшы, вырашыў спачатку выпрабаваць сябе ў конкурсе ў вядомае Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.Крупскай, на аддзяленне "Тэатральнае мастацтва".

Ужо на другім курсе, пасля ўдзелу ў дыпломнай пастаноўцы чацвёртакурснікаў, зразумеў, што яму больш падабаецца не проста самому ствараць вобразы, а дапамагаць іншым працаваць над роллю, арганізоўваць, карэкціраваць, што магчыма толькі ў рэжысёрскай прафесіі. Пасля заканчэння навучальнай установы Андрэй вярнуўся ў родны Камянец з маладой жонкай і пачаў працаваць у раённым Доме культуры. За два гады арганізаваў шмат розных святочных мерапрыемстваў. Дзень моладзі, Дзень горада, 9 Мая, свята Ураджаю... Сам піша сцэнарыі, прычым, звяртаецца не толькі да сваёй фантазіі, а і да гісторыі, выкарыстоўвае народныя традыцыі.

А яшчэ малады рэжысёр заклапочаны тым, каб як мага больш падлеткаў зацікавіць клубнай работай. Бо яму не вельмі падабаецца, калі моладзь вольны час праводзіць у нецвярозай кампаніі. Лічыць: каб хоць два разы на месяц яны прыходзілі ў Дом культуры, то зразумелі б, што на свеце ёсць шмат цікавага. "У нас жа вельмі багатая культурная спадчына, і, на жаль, шмат хто з моладзі пра гэта нават і не здагадваецца, не цэніць", — засмучаецца Андрэй.

У яго ўжо ёсць аднадумцы, захопленыя тэатрам. Рэпеціруюць спектакль Разумоўскай "Сад без зямлі", крыху раней паставілі тэатральныя мініяцюры пад назвай "На нас глядзяць зоркі". Мараць пра лепшыя дэкарацыі, пра асвятленне сцэны, новыя пастаноўкі. І магчыма, дзякуючы ўлюбёнаму ў тэатр Андрэю, народзяцца на правінцыяльнай сцэне новыя тэатральныя зоркі.

Таццяна ІВАНЮК.

пінск, францысканскі касцёл

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

конкурсы

ЯШЧЭ АДНА ПРЫСТУПКА

Паспяхова сыграўшы ва ўсіх трох турах конкурсу піяністаў імя Э.Дзюрле, які праходзіў у сакавіку ў Антверпене (Бельгія), студэнт трэцяга курса Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Віталь Стахіевіч (на здымку) стаў лаўрэатам, атрымаўшы сёмую прэмію сярод 38 удзельнікаў з усіх краін свету.

Для маладога піяніста — вучня вядомага педагога, прафесара акадэміі музыкі Зоі Качарскай — гэта не першы поспех. Ён ужо прымаў удзел у міжнародных прэстыжных музычных фестывалях і конкурсах у Вялікабрытаніі, Італіі, Грэцыі, Малдове.

Аляксандр ДЗІДЗЕВІЧ, БелТА.

кропка на карце

ЗДЗІТАВА АДЗНАЧЫЛА 750!

Адно з самых даўніх паселішчаў на тэрыторыі Бярозаўскага раёна Брэстчыны – вёска Здзітава адзначыла сваё 750-годдзе. Усіх, хто прыязджае ў вёску Здзітава, сустракае помнік "Здзітаўская абарона", узведзены ў 1975 годзе па праекце скульптара В.Кліменкі і архітэктара В.Пака ў гонар савецкіх воінаў і партызан.

Непадалёку ад гэтага мемарыяла ў двары мясцовага Дома культуры ўстаноўлены камень з мемарыяльнай шыльдай, дзе апавядаецца аб даце першага ўпамінання гэтага паселішча ў Іпацьеўскім летапісе. Адсюль, ад святога для вяскоўцаў месца, і стартавалі ўрачыстасці з нагоды свята вёскі.

Шмат хто з гасцей успамінаў аб мінулым Здзітава. У прыватнасці, ураджэнец гэтых мясцін акадэмік Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта Васіль Сычык сваё прывітанне пачаў з пажаданняў сваім землякам, згадаў гісторыю краю і гэтай вёскі. Выказаў думку аб больш даўнім паходжанні паселішча IX–X стагоддзяў). Зазначыў, што Здзітава ўваходзіла ў Турава-Пінскае княства, затым у ВКЛ. Здзітаў быў горадам з палацам і царквою, але ў сувязі з войнамі ў XVII стагоддзі горад ператварыўся ў вёску.

З глыбіні стагоддзяў вядзе адлік гісторыя Здзітава. Тэатралізаваная дзея, наколькі гэта было магчыма на імправізаванай вясковай сцэне, пераносіла ў тое далёкае лета 1250-га.

Ёсць некалькі меркаванняў наконт паходжання назвы Здзітава. Адна з версій грунтуецца на старажытнасці паселішча Здзітаў — абапіраючыся на ўкраінскую мову, выраз "з дзідоў" можна перавесці — "ад дзядоў", "дрэўні" — старажытны. Ёсць і іншыя паданні. І кожнае мае права на існаванне. Вякі мінулыя пакінулі шмат загадак. Бясспрэчна адно, што гэтае паселішча на рацэ Ясельдзе — калыска ўсяму Бярозаўскаму краю.

Паступова перыяд за перыядам на сцэне адлюстроўваецца гісторыя здзітава-спораўскага краю. Аб людзях вёскі гаварылі не толькі вядучыя, але і тыя, хто выступаў з успамінамі. Згадвалі, як у 1950 годзе тут быў створаны калгас імя Чкалава, як ішло асушэнне балот Палесся і побач распачыналася будаўніцтва Бярозаўскай ДРЭС. Аб гэтым і іншым памятаюць доўгажыхары вёскі Здзітава: Васіль Буранка, Алена Гладкоўская, Ганна Глазоўская і іншыя ветэраны.

80-я гады XX стагоддзя. З асушэннем балот Палесся пашыраліся межы калгаса "Спорава", куды зараз уваходзяць дзве вёскі — Здзітава і Спорава. Кіраўніцтвам калгаса "Спорава" і Спораўскага сельскага Савета ўшаноўваліся старанныя працаўнікі гаспадаркі. Падводзіліся вынікі на лепшы падворак з даволі значнымі і так неабходнымі прызамі — парсючком, мяшком цукру і г.д.

Сям'я — вось што так моцна трымае чалавека на зямлі-карміцельцы. Сёння ў Здзітаве пражывае 1 090 чалавек. І яшчэ важная акалічнасць, што робіць гонар гэтай вёсцы. Тут, у Бярозаўскім раёне, пражывае найбольш, чым дзе, жанчын, якія нарадзілі дзесяць і больш дзяцей. Такіх сем'яў — дванаццаць. Ушаноўваліся пары, якія адзначылі значныя сямейныя юбілеі: 50, 55 і 65 гадоў сумеснага жыцця.

Вось так талакой, як і належыць, зладзілі здзітаўцы свята вёскі.

Пётр ЖЭБРАК.

вернісаж

"ПЕСНЯ АБ РАДЗІМЕ" ТАМАРЫ КІРШЫНАЙ

У фае Палаца культуры ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» прыцягвае ўвагу наведвальнікаў арыгінальнае пано «Песня аб Радзіме» (памеры 8 х 2,5 метра), якое адлюстроўвае гісторыю беларускага народа з язычніцкіх часоў да канца XX стагоддзя.

Яно вылучалася на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Аўтар — Тамара Кіршына, ураджэнка горада Калінкавічы.

Тут гісторыя нашай Радзімы падзяляецца на тры ўмоўныя часткі. Першая — ад язычніцкіх часоў да гісторыі Кіеўскай Русі (сімвалам з'яўляецца трохгаловы змей) і створана на падставе твора «Слова аб палку Ігаравым». Аддзяляе кампазіцыю моцнае дрэва грушы, што сімвалізуе характар беларускага народа: сілу, мужнасць, вынослівасць. У другой частцы ідзе аповед пра рэвалюцыю, няпросты 1937-мы год. Цэнтральнае месца адведзена Вялікай Айчыннай вайне, дзе мастачка Т.Кіршына адлюстравала ў кампазіцыі людзей многіх нацыянальнасцей: рускіх, беларусаў, украінцаў, якіх з'яднала перамога ў другой сусветнай вайне. Аснова трэцяй часткі — увасабленне беларускага Палесся — хлопчык, які іграе на жалейцы.

Усе вобразы акружаны святлом і падзеямі, такімі жыццёвымі і вечнымі. І ўспрымаюцца яны, як пастаянная мара чалавека лятаць, сягаць да вышынь, як птушка. Нягледзячы на складанасці і ўмоўнасці жыцця чалавецтва, яго суправаджае прыгажосць. У вобраз цяжарнай жанчыны мастачка ўклала пачуцці, эмоцыі, якія ахопліваюць кожнага, калі мы шчаслівыя. Але зноў трагедыя: аварыя на Чарнобыльскай АЭС... Трымаюць кампазіцыю чатыры планеты, яны і ствараюць прастору часу. Цікавасць выклікае пластычнае рашэнне фігур, заснаванае на кантрасце аб'ёму і глыбіні, якія падкрэсліваюцца колерам. Кожная з 37 фігур пано вылучаецца непаўторнасцю і адлюстроўвае пэўны перыяд. Нягледзячы на працяглы час выканання (больш трох з паловай гадоў), кампазіцыя лёгкая і прыгожая і зроблена, нібы на адным дыханні.

Мастачка Тамара Кіршына адмовілася ад якіх-небудзь касцюмаў, старалася не надаваць свайму твору прыкладны характар. Даволі незвычайны варыянт прапануе аўтар, падаючы вобраз дзіка як сімвала беларускага краю. Адносна гэтага ў кожнага з нас можа ўзнікнуць сваё асэнсаванне ўбачанага...

Аб'ядноўвае кампазіцыю і лагічна, і філасофскі дыскусія, якая прымушае нас задумацца аб мінулым, сучаснасці і будучыні. Застаецца нявырашаным адно пытанне — пра будучыню. І гэтае пытанне для ўсіх застаецца без адказу.

Пётр ЖЭБРАК.

юбілеі

Да 525-годдзя горада Бярозы рэспубліканскае дзяржаўнае аб'яднанне «Белпошта» выпусціла мастацкі маркіраваны канверт і паштовую марку з выявай кляштара картузіянцаў, які падаецца з малюнка мастака-графіка гісторыка-архітэктурных пейзажаў Напалеона Орды, ураджэнца вёскі Варацэвічы на Брэстчыне.

КЛЯШТАР У КАРТУЗСКАЙ БЯРОЗЕ І ЖЫЦЦЁ Ў ІМ — ДАСЛЕДУЮЦЦА

Варта зазначыць, што манастырскі комплекс мае статус помніка рэспубліканскага значэння ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР ад 18 лютага 1988 года. Пабудовы кляштара і для манаскага жыцця добра апісаны ў шэрагу гістарычных крыніц, падарожных нататках і ў літаратуры. Аб наведванні кляштара Святога Крыжа ў Картузскай Бярозе ёсць сведчанні і добрае апісанне гэтых мясцін у кнігах польскага пісьменніка і публіцыста, гісторыка Юльяна Урсына Нямцэвіча «Дзённікі маіх часоў» (1848) і ў яго працы «Гістарычныя падарожжы на польскіх землях, што адбыліся ад 1811 да 1828 гг» (1858). Даволі каштоўную крыніцу для вывучэння каталіцызму, а таксама гісторыі нашага краю і краін можна пачарпнуць са знойдзенага ксяндзом Генрыкам Гзэла СВД у 1980-м годзе ў Вышэйшай духоўнай семінарыі ксяндзоў Вярбістаў у Пянёнжне, што ў Польшчы, манускрыпта XVII стагоддзя. Манускрыпт мае назву «Historia Centum Annorum Cartusiae S.Crucis Prope Berezam in Lithuania Sitae». Рукапіс складаецца з 459 старонак, аднак некаторыя з іх адсутнічаюць. Ён змяшчае шмат копій дакументаў і лістоў стогадовай хронікі з паўсядзённага жыцця кляштара картузаў Св.Крыжа ў Бярозе, напісанай на лацінскай мове. Манускрыпт, знойдзены ў 1980 годзе ў Польшчы, зараз даследуецца.

Падрыхтаваў Іван ГРАК.

занатоўкі даследчыка

КАРОЛЬ РАДЗІВІЛ ПАНЕ КАХАНКУ

ПА СТАРОНКАХ КНІГІ ГЕНРЫКА ЖАВУСКАГА "УСПАМІНЫ САПЛІЦЫ"

Генрык Жавускі (1791-1866) — адзін з найбуйнейшых польскіх пісьменнікаў XIX стагоддзя. Адам Міцкевіч, з якім Жавускі пазнаёміўся ў Рыме, быў захоплены яго аповедамі пра час Станіслава Аўгуста Панятоўскага і пераканаў яго ўзяцца за пяро, прадказваючы велізарны поспех.

Улюбёны ў Літву-Беларусь, Жавускі ў асноўным напісаў усе свае лепшыя творы на беларускія сюжэты. Знаходжанне на Беларусі наклала адбітак на ўсё жыццё пісьменніка.

Зрэшты, і Юзаф Крашэўскі, яго маладзейшы калега па пяру, які сябраваў і ліставаўся з нашым першым прафесійным пісьменнікам Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам і горача вітаў яго пачынанні на "літвінскай гаворцы", прынцыпова называў сябе літвінам.

У 1833 годзе Жавускі пасяляецца ў адным са сваіх маёнткаў на Валыні, уваходзіць у гурток пісьменнікаў клерыкальна-шляхецкага накірунку. Пад псеўданімам Яраш Бэйла выдае ў 1841-1843 гадах збор сатырычных нарысаў, якія ўзнялі цэлую буру ў польскім грамадстве. У канцы 40-х гадоў з'яўляюцца яго гістарычныя творы"Zamek Krakowski" (1847), раман пра часы караля Станіслава Панятоўскага "Listopad" (1849). Пазней былі напісаны раманы і аповесці "Adam Smigielski" (1851), "Laska i przyznaczenie" (1851), "Rycerz Lizdejko" (1852), "Zaporozec" (1854), "Pamiętniki Michalkonskiego" (1857), "Paz Zlotogiawy" (1858) і іншыя.

Атрымаўшы пасаду служачага па асобых даручэннях пры князю Паскевічу, намесніку ў Царстве Польскім, Жавускі з 1850 года жыве ў Варшаве. У 1851 годзе пачынае выдаваць "Dzienik Warszawski", які стаў цэлай эпохай у летапісе польскай прэсы: гэта было першае польскае выданне заходнееўрапейскага ўзору. Аднак з-за спавядання клерыкальна-арыстакратычных ідэалаў, прамалінейнай рэакцыйнасці выдаўца, русафільства Жавускі прыйшоўся не да густу польскай публіцы і быў вымушаны пакінуць рэдактарства і вярнуцца ў 1856 годзе на Валынь, дзе і памёр.

"Успаміны Сапліцы" — па сутнасці кніга адмысловых гістарычных навел, напісаных у жанры літаратурнай мемуарыстыкі. Мемуарны жанр быў надзвычай папулярны на Беларусі і ў Польшчы ў XVII-XIX стагоддзях, бо гэта быў час вялікіх і трагічных падзей у гісторыі нашай краіны і народа.

Падзеі ў кнізе адбываюцца пераважна на Беларусі — у Навагрудку, Міры, Нясвіжы, Менску, Вільні, часткова на Украіне і ў Польшчы. У маёнтку Валамечцы будучы пісьменнік з захапленнем слухаў аповеды пра падзеі шматгадовай даўнасці, канфедэрацкія войны, магнатаў і шляхту, розныя цікавыя выпадкі і здарэнні. Адсюль, мусіць, такое замілаванне старым шляхецкім побытам і звычаямі, настальгічны сум перад няўмольнасцю адыходу патрыярхальнасці, так любай сэрцу галоўнага героя кнігі Севярына Сапліцы, асобы выдуманай, нерэальнай. У кнізе перад намі праходзіць цэлая галерэя выдатных палітычных і дзяржаўных дзеячаў Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII стагоддзя, канфедэрацкія войны (Барская, Таргавіцкая, Радомская канфедэрацыі — па сутнасці грамадзянскія войны ў нашай дзяржаве, якія падрывалі магутнасць і адзінства і былі інспіраваны звонку). Побач з вядомымі гістарычнымі асобамі, такімі, як апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, князь Кароль Радзівіл Пане Каханку, віленскі ваявода граф Багуслаў Агінскі, віцебскі ваявода Тадэвуш Рэйтан — адна з самых трагічных асоб у нашай гісторыі, шмат малавядомых постацей: Валадковіч, Сава, Бялецкі, Равенскі, Лешчыц, ксёндз Марэк і іншыя. Пішучы пра Панятоўскага, Жавускі спачувае былому каралю. На першы погляд герой падаецца нам вельмі сентыментальным, нават наіўным у сваім замілаванні і захапленні вялікімі свету гэтага (ён сам з беднай, шарачковай шляхты).

"Успаміны Сапліцы" — апафеоз Каролю Станіславу Радзівілу II. Яшчэ пры жыцці Пане Каханку пры яго двары былі напісаны ананімныя "Успаміны пра князя Кароля Радзівіла", у падзагалоўку да якіх адзначаецца, што яны створаны паводле матэрыялаў нясвіжскага архіва. "Успаміны" маюць дакументальную аснову, багатыя канкрэтнымі рэаліямі, але тое, што яны былі сфабрыкаваны, не выклікае сумнення, бо Пане Каханку паказаны ў іх ледзь не анёлам.

У сваім творы, а ва "Успамінах" дваццаць тры раздзелы-навелы, у якіх прама ці ўскосна дзейнічае галоўны герой Севярын Сапліца, але Пане Каханку выступае ў большасці з іх, Жавускі паказвае князя-ваяводу віленскага таксама толькі са станоўчага боку, абвяргае сцвярджэнні, што ў маладосці Радзівіл праславіўся рабаваннем на Літве, наездамі на шляхецкія ўладанні, распустай і п'янствам. Замежныя аўтары, у прыватнасці французы і швейцарцы, якія ці то гасцявалі ў Нясвіжы, ці то чулі пра Пане Каханку, называлі яго барбарам і невукам. Іх прыводзіла ў жах захапленне князя мядзведзямі, якіх ён меў больш за тысячу ў так званай Смаргонскай мядзведжай акадэміі, дзе іх вучылі дзеля прадстаўлення перад князем і яго шматлікімі гасцямі.

Адзін з лепшых дакументальных партрэтаў Кароля Радзівіла Пэне Каханку, на нашу думку, створаны Уладзіславам Сыракомлем у гістарычным нарысе "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" (1853). У ім цэлы раздзел, прысвечаны выключна князю, дзе Сыракомля, які, як вядома, пэўны час працаваў у нясвіжскай канцылярыі і меў доступ да архіваў, абапіраючыся на вядомыя і ім самім адшуканыя звесткі, распытваючы людзей, якія ведалі Радзівіла, стварае непрадузяты вобраз Пане Каханку. Паэт не кідаецца ў крайнасці, а распавядае пра Радзівіла, аднаго з найбагацейшых людзей Еўропы, "усемагутнага князя ў Альцы, Нясвіжы, Біржанах, Дубінках, Слуцку і Капылі, графа ў Шыдлоўцы, Міры, Белай і Крожах, магната ў Невелі, Себежы, Заблудаве, Койданаве, Копыці, апекуна некалькіх старостваў-каралеўшчын, які яшчэ быў і ўладальнікам вялікіх маёнткаў на Валыні і Украіне, што яму дасталіся па маці, Уршулі з Вішнявецкіх, які меў шматмільённыя гадавыя прыбыткі, як пра жывога чалавека, пра яго свавольствы, авантуры і пагулянкі.

Што і казаць, багацце ды і грамадскае становішча Кароля Радзівіла, а ў пяць гадоў ён ужо атрымаў ад пфальцкага курфюрста ордэн святога Губерта, а ў трынаццаць гадоў быў маршалкам віленскага сойміка, праз год быў абраны ад Ашмянскага павета ў Сойм, у шаснаццаць гадоў — чалец трыбунала, у семнаццаць — палкоўнік, у васемнаццаць — ужо падчашы, а праз колькі месяцаў — мечнік, у дваццаць адзін год Пане Каханку ўжо быў маршалкам трыбунала, а пасля смерці бацькі, гетмана вялікалітоўскага, у дваццаць восем становіцца першым сенатарам княства — віленскім ваяводам, — забяспечвалі князю беспакаранасць ва ўсіх яго учынках. Калі яго яшчэ стрымлівалі пры жыцці маці, вядомая ў XVIII стагоддзі пісьменніца, драматург, і бацька, то пасля іх смерці пачынаецца разгульнае жыццё князя, а таксама жорсткая, зацятая барацьба з палітычнымі праціўнікамі.

Адам Мальдзіс у сваім нарысе быту і звычаяў "Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя" называе Кароля Радзівіла Пане Каханку асобай трагікамічнай.

Кароль Станіслаў Радзівіл у вышэйшай ступені быў чалавекам дзяржаўным, багацце і амбіцыі былі прычынай таго, што ён лічыў сябе (і так было на самай справе) адным з галоўных прэтэндэнтаў на каралеўскі трон. Але гісторыя распарадзілася інакш. Каралём Рэчы Паспалітай становіцца стаўленік Кацярыны II Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, якому па радавітасці, багацці, дзелавых якасцях было далёка да "нясвіжскага караля". Пасля некалькіх антыкаралеўскіх канфедэрацый, якія ўздымаў сам Радзівіл ці ў якіх прымаў удзел, ён са сваім двaром апынуўся ў выгнанні ў Турцыі, Вугоршчыне, Влохіі, Аўстрыі, Францыі, Саксоніі і Баварыі, Чэхіі без сродкаў, бо яго ўладанні былі секвестрызаваны і не было паступленняў, а калі пачаліся падзелы Рэчы Паспалітай, у Кароля Радзівіла да таго ж адпалі вялікія ўладанні з 90 тысячамі душ ва Усходняй Беларусі. Выгнанне князя ўрэшце закончылася прымірэннем з каралём Станіславам Аўгустам, ён прысягнуў на вернасць законнаму манарху. Радзівілу былі вернуты яго ўладанні і пасады, кампенсаваны страты. Але гонар князя не атрымаў сатысфакцыі. Прысязе ён быў верны да канца, але з каралём яны так і засталіся незычлівымі адзін аднаму.

Кароль Радзівіл быў тыповым прадстаўніком свайго часу і свайго асяроддзя. З сённяшніх пазіцый і меркаванняў аб'ектыўна ацаніць гэтую асобу складана.

У Белай (адна з ардынацый Радзівіла) памірае адзінокі, зусім аслеплы чалавек, памірае з пераканаццем, што "жыў для Айчыны". Айчыны праз годдва не стане. І ў гэтым будзе вялікая віна чалавека, супраць якога і яго прыхільнікаў Кароль Радзівіл уздымаў канфедэрацыі, зацята змагаўся не адзін год, а потым цярпеў у выгнанні, не страціўшы гераічнага духу.

"...Гэта дзікае сэрца было насамрэч добрым, шляхетным і адгукалася на ўсё прыгожае, у гэтай дзівакаватай галаве жылі здаровыя і канструктыўныя думкі", — канстатуе Сыракомля.

Трохразовае выгнанне, частыя палітычныя няўдачы вымучылі Радзівіла, на яго вачах гіне Айчына — знікае з гістарычнага небасхілу найвялікшая дзяржава — Рэч Паспалітая.

Дык хто ж ты, Кароль Станіслаў Радзівіл II Пане Каханку?

"Нясвіжскі Фальстаф", прыгоннік, дабрадзей, дзяржаўны муж, асветнік ці невук, авантурыст, дзівак-фантазёр з адкрытым усім людзям сэрцам?

Алег ДЫШЛЕВІЧ.

зваротная сувязь

ЛАТВІЯ

НАТХНІЛІ ПЕСНЯРЫ

У Цэнтры беларускай культуры Даўгаўпілса праходзіць выстава малюнкаў па творах выдатных беларускіх песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Падрыхтавала яе Алена Бучэль, студэнтка V курса Даўгаўпілскага універсітэта.

У духоўным жыцці беларусаў Янка Купала і Якуб Колас займаюць асобае месца. Для беларускай моладзі творчасць песняроў — бясцэнны скарб. Мы, дарослыя, ганарымся, што наша моладзь захоўвае галоўны запавет паэтаў-класікаў — любіць Радзіму і паважаць родную мову.

Галіна САНТОЦКАЯ.

ІЗРАІЛЬ

ЗБІРАЮЦЬ ЗВЕСТКІ

Камісія "Памяць паўшых" пры Рэхавоцкім акруговым камітэце Саюза ветэранаў другой сусветнай вайны — змагароў супраць нацызму працягвае работу па зборы пайменных даных воінаў-яўрэяў, якія загінулі на франтах другой сусветнай вайны.

Усе звесткі заносяцца ў электронную "Кнігу памяці", якая ў бліжэйшы час будзе ўстаноўлена ў інтэрнэце, а таксама правяраецца наяўнасць гэтых звестак у "Кнізе памяці", якая выдаецца Саюзам яўрэяў інвалідаў і ветэранаў вайны (СЯІВВ) Расіі.

Пры неабходнасці звесткі накіроўваюцца ў выдавецкі цэнтр СЯІВВ для ўключэння ў чарговы том.

Камісія "Памяць паўшых" просіць усіх, у каго ёсць звесткі аб воінах-яўрэях, якія забіты, памерлі ад ран ці загінулі ў палоне і канцлагерах у час другой сусветнай вайны, паведаміць на адрас:

Ізраіль, Ашкелон, 78300,
вуліца Алей Хагардам, 23/16,
Заслаўскаму Аляксандру.
Тэлефон для даведак: 08671-49-64,
Аляксандр.
Адрас у інтэрнэце: zasalex@mail.ru
Камісія "Памяць паўшых".

ПАЛАЧАНКА СТАЛА КАЗАЧКАЮ

Дужа парадаваў мяне чарговы ліст з палтаўскага сяла Свяцілаўка. Аўтар пісьма – колішні настаўнік Астрынскай СШ імя Цёткі, былы начальнік штаба партызанскай брыгады імя Ленінскага камсамола, што дзейнічала на сумежжы Шчучынскага, Гродзенскага і Воранаўскага раёнаў, І.Анапрыенка.

Разам з лістом Іван Паўлавіч паклаў у канверт невялікую выразку з газеты "Зара Палтаўшчыны" пад загалоўкам "Лясная панна" — палац кахання". У нататцы апавядаецца пра памятную падзею ў жыцці мясцовай інтэлігенцыі. А менавіта аб прэзентацыі паэтычнага зборніка Іны Снарскай у клубе цікавых сустрэч пры абласной навуковай бібліятэцы імя І.Катлярэўскага.

Іна Снарская добра знаёмая чытачам "Голасу Радзімы". Яна нарадзілася і вырасла ў беларускім Полацку. Там жа ў шасцігадовым узросце склала свой першы верш. І вось ужо пятнаццаць гадоў жыве паэтэса ў Палтаве, працуе на тутэйшай тэлестудыі. Яе змястоўныя перадачы высока цэняць гледачы і з нецярплівасцю чакаюць новых сустрэч на тэлеэкране. Далей газета адзначае, што Іна паспяхова вучыцца ў Палтаўскім педуніверсітэце, валодае ўкраінскай мовай. А сны свае бачыць і вершы піша на роднай мове.

Новую, трэцюю па ліку, кнігу паэзіі І.Снарская назвала "Лясная панна". Нямала вершаў паэтэса прачытала на прэзентацыі. У іх — гармонія, хараство, агонь бліскавіцы... Гэты зборнік, як адзначыў Леанід Дранько-Майсюк, — сапраўдны палац кахання.

Вялікі дзякуй, мілы Іван Паўлавіч, за добрае стаўленне да нашай зямлячкі.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ.

паэтычная імпрэза

Васіль ЖУКОВІЧ

САНЕТЫ

ЯК НА КРЫЖЫ

Шляхоў скразных вялікіх
скрыжаванне,
нібы цяжкі, страшэнны крыж, ляжыць,
і ты распнутая на тым крыжы,
о, Беларусь, маё жыццё й каханне!

Жывая ты, хоць на крыжы як жыць!
Крывавяць раны, сціснута дыханне,
вакол шыпенне чуеш і цкаванне,
арол-крумкач працягвае кружыць...

Мая краіна, боль свой перасіль —
паўстань сама, ніхто з крыжа
не здыме,
зірні на свет вачыма маладымі,

вядзі свой шлях, падмогі не прасі.
І даражы сваім свяшчэнным імем —
сябе распнуць ты болей не дасі.

БЕЛАРУСКАЯ СТАЛІЦА

Ці сонца над табою, ці зарніцы,
аблокі кучаравыя ці зоры, —
люблю цябе, мой родны светлы горад,
ціхмяна-задуменная сталіца.

Хай Свіслачы крынічнай нашай сніцца
спакойнае ці пеністае мора,
а мы з табой памарым на прасторы
пра шчасце, запаветная сталіца.

Хай дабрыня ў вачах людзей іскрыцца!
Мне даражэй за ўсё на белым свеце,
калі між нас любові сонца свеціць.

Святла непераможная крыніца.
Нахлынуць хмары — іх разгоніць вецер.
Жыві, красуйся ў вечнасці, сталіца!

МАЁЙ МАДОННЕ

Прымі, Мадонна, шчырае прызнанне,
яно ў наяўнасці маіх грахоў:
што даў, апроч сямейных ланцугоў?
Што ўзяў я сам, тут лішняе пытанне.

Я ведаю: няма мне апраўдання
і не шукаю апраўдальных слоў.
Жыў як папала гэтулькі гадоў!
І вось перад табою — з пакаяннем.

Яго Усявышні можа не прыняць,
калі мне ты, жанчына, не даруеш.
Трывушчая, ты ўмееш дараваць...

Усё жыццё сабою ахвяруеш.
Вось пад вянцом дачка ўжо крыж цалуе.
Прад ёй твой подзвіг будзе паўставаць.

ПРЫРОДА

Люблю цябе і слухаю, прырода,
такая блізкая парой любой!
Зачараваны змалку я табой,
тваёй бунтоўнасцю, тваёй лагодай.

Я да цябе прыходжу то з журбой,
то з добраю душэўнаю пагодай,
з табой сустрэчы — сэрцу асалода;
з табой разлуку назаву бядой.

Ты ўся — ад жоўтай зоркі дзьмухаўца
да сонца і да просіні нябёснай —
вялікі цуд вялікага тварца.

Няхай мільгаюць восені і вёсны,
мяне натхняе гэты свет дзівосны,
няма якому краю і канца.

ЖАДАННЕ

Хачу кахаць, кахаць і быць каханым,
зусім на адзіноту не хварэць —
у полымі дваіх часцей гарэць,
вясёлым, чыстым і самаадданым.

Што небам добрым мне наканавана?
Хачу адно жаданую сустрэць.
Паняцце ўсім вядомае старэць
да старасці хай будзе неспазнана.

О вы, мае памкненні, мроі, крозы!
Адно не здрадзіць — збыцца вас прашу,
я ведаю жыцця метамарфозы...

Так нечакана споведзь завяршу:
зіма калісьці апячэ марозам,
а зараз лета ў сэрцы я нашу.

САД

Бачу свята пчалы ў вечнай працы
і шпака шчасце ў песні свабоднай;
сад у квецені, садзе мой родны,
мне так цяжка з табой разлучацца!

Да цябе буду вечна вяртацца,
вастравок мой жывы і лагодны,
тут не будзе мой позірк халодны,
будзе сэрца табой чаравацца.

Дрэмле завязь у кветках ружовых —
цуд спрадвечны і кожны раз новы:
ў цвеце — плод, а у плодзе — насенне.

Думкі ткуцца парою вясновай
пра святое імгненне цвіцення
і пра вечнасць падобных імгненняў.

НЯВЕСТА

Дало тваё вяселле мне лагоду:
шчасліваю, Святлана, ты была,
здавалася мне кветкаю святла
на фоне завядаючай прыроды.

Твая краса не ведала нягоды,
у змрочным лістападзе ўся цвіла,
ты ў белым плацці пад вянец ішла,
і ззялі у вачах любоў і згода!..

Тваё вяселле згадваю не раз
і ўсмешку тваю светлую, Святлана;
ці не вяршыняй шчасця быў той час?..

Як ты жывеш? Ці беражэ каханы?
Ці бляск тваёй усмешкі не пагас?
Ці будзе шлях твой радасцю усланы?

У ЧАЛАВЕЧЫМ САДЗЕ

На цвет мароз нярэдка налятае
і хмара шкоднікаў, і сыпле град.
Няма спакою ўсім, хто мае сад,
плады дагледзець — клопату хапае.

Сад чалавечы пышна расцвітае,
жывым раслінам — дзецям —
хто не рад!
Ды іх чакае мёд жыцця і яд...
Ну, словам, з дзецьмі хто трывог
не знае?!

Хто б ты ні быў, стары ці малады,
калі табе дастануцца плады,
садоўніка успомні добрым словам.

Нявестка й зяць, вы шанаваць гатовы
сваіх абраных шчыра —
не на словах —
і іх бацькоў трывушчых заўсягды?

ІЛЮЗІЯ

Якая ціша на зямлі пануе!
Які пагодліва-цудоўны дзень
па родным краі, па зямлі ідзе!
У час такі здаецца: ўсім шанцуе.

Здаецца, што на свеце не існуе
трагедыі чарнобыльскай нідзе,
ні іншых цяжкіх бедаў у людзей,
калі спакой паблізу дамінуе.

Здаецца, ўсюды мір і кроў не льецца.
Ніхто не гіне з голаду, здаецца,
ніхто не застаецца без страхі...

Ды сэрцу памяць іншае гаворыць:
пра зло, пра войны, разбурэнні, гора,
пра свет людзей, і чэрствых, і глухіх.

САМАГУБСТВА ІУДЫ

Іуда не спужаў Хрыста,
яго прадаўшы (час Пілата...).
Ісус, укрыжаваны катам,
з памерлых назаўжды паўстаў.

А вось Іуда мёртвым стаў.
І пры жыцці не стала святам
яму узнагарода-плата,
ён срэбра і не скарыстаў.

Быў дужа цяжкі грэх ягоны,
грэх і прывёў яго да скону,
у ганьбе здраднік жыць не змог,

бясслаўна у пятлі загінуў...
Прадбачыў загадзя ўсё Бог
ды на Зямлю прыслаў нам Сына.

ФОРМА І ЗМЕСТ

Мяркуеш пра жанчыны хараство
па тым, што называюць абалонкай,
ты зводзіш кожны раз сваю гамонку
да "класнае фігуркі" (выраз твой).

Хай цешымся мы кветкаю жывой
і водарам яе пяшчотна-тонкім,
красу жанчыны не спазнаеш звонку.
З ёй можна параўнаць мастацкі твор,

бо ў творы, уяві ты, калі ласка,
здараецца даволі часта так:
ні думкі, ні пазіцыі уласнай,

ні пачуцця не выявіў мастак, —
за дасканалай формай,
знешнім бляскам
хаваецца часова пустата.

УНУШЭННЕ

Ты сам сябе ў старыя залічыў,
гадоў сваіх пачаў баяцца ношы,
бяссонымі зрабіў раптоўна ночы,
ратунак твой — аптэкі і ўрачы.

Што рухацца павінен, не ўлічыў,
забыў, што па жыцці
нядаўна крочыў,
упаў душой, бы хто цябе сурочыў, —
адчуў сябе нібы ў паралічы.

Няўжо табе усё яшчэ не ясна:
ты правакатар старасці заўчаснай,
ёй паказаў, як да цябе прайсці.

Кульгаць пачаў,
узброіўся падпоркай...
Шпурні хутчэй свой посах
сумна-горкі,
Ўсміхніся сонцу, тэпай па жыцці.

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

краязнаўства

У МАСКОЎСКІМ "СКАРЫНІЧЫ"

У 2000 годзе ў Беларусі ці не ўпершыню шырока, наколькі гэта магчыма ў дачыненні да вучонага і пісьменніка, быў адзначаны 100-гадовы юбілей Міколы Каспяровіча (1900-1937), лексікографа, мастацтвазнаўца, этнографа, краязнаўца і публіцыста, які нарадзіўся ў пухавіцкай вёсачцы Ізабалёва.

У Мінску ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя (удзельнічалі і вучоныя з Расіі і ЗША). Там жа і была разгорнута унікальная выстава фотаздымкаў, іншых дакументальных матэрыялаў, якія расказвалі пра нашага земляка. Да справы ўшанавання Міколы Каспяровіча самым цесным чынам далучыліся ў 2000 годзе і аддзел культуры Пухавіцкага райвыканкама, Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей, Пухавіцкая раённая цэнтральная бібліятэка, Чырвонакастрычніцкая базавая школа. Свайго роду Каспяровічаўскія краязнаўчыя чытанні адбыліся ў музеі. Там была разгорнута і выстава да юбілею М.Каспяровіча. Памятную дошку ў знак славутага земляка адкрылі на будынку Чырвонакастрычніцкай школы.

Сярод тых, хто наведаў Пухавішчыну тымі юбілейнымі днямі, быў і вучоны-гісторык з Масквы Аляксей Каўка. Вось ужо болей як дзесяць гадоў ён збірае, рыхтуе, а пасля і выпускае літаратурна-навуковы гадавік "Скарыніч". Толькі што выдадзены (пяты па ліку) зборнік у значным, асобным раздзеле прадстаўляе матэрыялы пра Каспяровіча. Іх публікацыі папярэднічае ўступны артыкул Аляксея Каўкі — "Наш Мікола Каспяровіч".

Аляксей Каўка слушна заўважае: "Яму замалада пашчасціла вызначыць магістральны накірунак сваёй уласнай дарогі: Беларусь, беларушчына, пазнаванне роднага краю. Нямала паспеў зрабіць за нядоўгае жыццё гэты надзіва адораны прыродай і бацькамі беларус. Менавіта праз яго апантанасць абраным шляхам дачасна, на чацвёртым дзесятку, гулагаўская куля абарвала шлях Мікалая Іванавіча Каспяровіча".

У каспяровічаўскім раздзеле "Скарыніча" — артыкулы самога краязнаўца "Родная мова" (газета "Беларусь", 7 лістапада 1919 года), "Родная мова і школа" ("Беларусь", 8 лістапада 1919 года), дакументы з архіва, паказанні М.Каспяровіча на следстве па справе "Саюза вызвалення Беларусі" (1930). Нельга без хвалявання чытаць гэтыя матэрыялы. Яны дапамагаюць больш шматгранна і цэласна ўявіць постаць, абсягі навуковай і краязнаўчай работы Міколы Каспяровіча.

Мінскае выдавецтва "Беларускі кнігазбор" выдае аднайменную серыю, вяртаючы да чытача і спадчыну малавядомых аўтараў. Мо з часам пабачыць свет і кніга М.Каспяровіча? У ёй маглі б быць надрукаваны самыя розныя артыкулы даследчыка, а таксама яго унікальная работа "Краязнаўства".

Зварот "Скарыніча" да лёсу Міколы Каспяровіча нагадвае і пра неабходнасць працягу работы па ўшанаванні памяці краязнаўца. У Пухавіцкім раёне — найперш. І самай дзейснай формай тут маглі б, павінны былі б стаць штогадовыя Каспяровічаўскія краязнаўчыя чытанні.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

ракурс

Фота БелТА.

Аляксандр РУСАНАЎ

ВОСЕНЬСКІЯ МАТЫВЫ

Там, дзе восень ідзе,
лес шумлівы радзее,
Вецер гоніць хмарыны
з-за цёмных ялін.
Грозны чуючы сівер,
лісты, як надзеі,
Адлятаюць на дол
з пачарнелых галін.
Расхінуўся жоўты веер,
Восень лісце ў неба сее.

Ліст кляновы — лета мроі,
Ліст бярозы — сонца слёзы...
Лісце івы і асіны
Па вадзе плыве, як іней...
Гоніць хмары
змрочны вецер...
Захінецца жоўты веер,
Ліст кляновы,
як затворнік,
Ляжа нам на падаконнік.

асоба ў бязмежжы часу

ІГНАТ ДАМЕЙКА

СТАРОНКІ БІЯГРАФІІ

Нягледзячы на адкрытае неадабрэнне, выказанае вучоным Ураду, вырашана было тым не менш выпусціць памятны медаль У яго гонар. Шматгадовая праца і велізарныя заслугі Дамейкі былі адзначаны яшчэ і самай вялікай у краіне пенсіяй — 6 000 піястраў у год.

Але няўрымслівая натура не дае яму спакою. У 1884 годзе 82-гадовы выгнаннік рашыў ажыццявіць сваю неадступную мару — убачыць родную зямлю. Разважыўшы, што царскія ўлады ўжо не ў сіле нічога зрабіць яму, сусветна вядомаму вучонаму, спадзеючыся, што царскія ўлады ўжо не будуць яго праследаваць, Дамейка рашыў наведаць радзіму, тым больш, што пасля смерці Мікалая I была абвешчана амністыя ўсім былым "палітычным злачынцам".

Раніцай 23 мая 1884 года на вакзале Сант'яга сабралася шмат людзей: гімназісты, студэнты, прафесары, дэпутаты, сенатары. Праводзілі былога рэктара сталічнага універсітэта, ужо пенсіянера дона Ігнацыя Дамейку, які нарэшце выбраўся наведаць сваю Бацькаўшчыну. А калі прыехаў пажылы мужчына, усе рушылі да яго. Пачуліся воклічы: "Віва, Дамейка!" Яго правялі да вагона, у якім звычайна ездзяць высокапастаўленыя асобы. Аркестр іграў нацыянальны гімн, выступалі сябры і ўрадоўцы. Пачаліся ўрачыстыя провады рэктара сталічнага універсітэта, што ўпершыню пакідаў сваю новую радзіму, ехаў наведаць родны край. Асабліва ўзрушылі словы вучня Нацыянальнага інстытута, які віншаваў дона Ігнацыя з радаснай хвілінай у жыцці, зычыў шчаслівай дарогі ў родны край, прасіў, каб ён усё ж хутчэй вяртаўся на другую радзіму, прыдбаную сэрцам.

У гэты ж дзень, 23 мая 1884 года, наш зямляк запісаў у сваім дзённіку: "Бывай здарова, Чылі! Дзякуй табе за мае 46 гадоў у табе працавітага жыцця, за тваю гасціннасць, за наданае мне ад цябе грамадзянства, за сям'ю, за гонар, павагу, якую знайшоў у твайго народа, за годнае забеспячэнне на астатак жыцця..."

З сабой ён вёз багатую калекцыю мінералаў у падарунак еўрапейскім універсітэтам. У Парыжы Дамейку ўрачыста віталі вучоныя Сарбоны. У Кракаве прысудзілі навуковую ступень ганаровага доктара. На варшаўскім пероне яго сардэчна сустракаў сябра студэнцкіх год польскі паэт Антон Адынец, адзіны, апрача Дамейкі, філамат, які яшчэ застаўся ў жывых. З Варшавы яны паехалі ў Беларусь.

Царскім уладам, вядома, не прыйшлося даспадобы гэта падарожжа — яны на чатыры месяцы затрымалі ў Гродне пашпарт вучонага. Нарэшце — родныя мясціны.

9 жніўня Дамейка разам са сваімі сынамі прыехаў у Гарадзею, дзе яго сустрэлі сваякі. На другі дзень ён быў у Міры, наведаў магілу бацькі.

Разам з Адынцом І. Дамейка тры месяцы вандруе па мясцінах свайго дзяцінства і юнацтва, дзе сталеў і набіраўся мужнасці: Мір, Сталовічы, Далматоўшчына, Навагрудак, Дзятлава, Ліда, Жыбуртоўшчына, Заполле.

Вінцэсь Каратынскі ў адным са сваіх артыкулаў успамінаў, што на памяць аб наведванні радзімы, аб сустрэчы з паэтам А.Адынцом Дамейка пасадзіў у Крошыне дубок і папрасіў высечы на камені вершаваны подпіс. І хто ведае, як зазначае Адам Мальдзіс, ці не Паўлюк Багрым выконваў гэтую просьбу свайго вялікага суайчынніка. Мясцовая інтэлігенцыя з энтузіязмам сустракала земляка, чалавека з легендарнай біяграфіяй. Беларускія сяляне падносілі яму хлеб-соль, віталі народнымі песнямі.

У вёсцы ён разгаварыўся з адной старэнькай бабулькай. Тая яму пакланілася і сказала: "Я пана маленькага помню". Гэтыя яе беларускія словы ён запісаў сабе ў дзённік. Пытаўся, што сталася з Лукашом, яго фурманам. Жанчына адказала, што памёр.

На радзіме Ігнат Дамейка прабыў чатыры гады. Але і тут не сядзеў на месцы. Пажыў у сям'і дачкі ў памятнай з дзяцінства Жыбуртоўшчыне. Пасля праз Адэсу паехаў у Турцыю, адтуль у Палесціну, Егіпет, доўга падарожнічаў па Італіі і Францыі. За час яго знаходжання на радзіме Дамейкавы сыны набылі патрэбную еўрапейскую адукацыю: Казімір скончыў тую ж самую, што і бацька, Горную школу ў Парыжы і хацеў заняць бацькава месца на кафедры ва універсітэце ў Сант'яга; Гернан жа атрымаў дыплом аб заканчэнні ў Рыме духоўнай семінарыі і таксама жадаў служыць радзіме сваёй маці. Нейкі час у Дамейкі была нават думка застацца на радзіме. Але сябры з Чылі клікалі вярнуцца ў гасцінную краіну.

Разам з сынамі мусіў вярнуцца на другую сваю радзіму і састарэлы Ігнат Дамейка. Перад ад'ездам колькі часу правёў ён у сям'і Уладзіслава Міцкевіча, сына вялікага паэта, свайго дарагога сябра. Ужо з парахода Ігнат Дамейка паслаў жонцы Уладзіслава Марыі пісьмо: "Меў я прыемнасць правесці астатнія дні выключна з тваім мужам, а цяпер праз пяцьдзесят гадоў пасля першага свайго падарожжа ізноў пускаюся ў мора. Буду вам пісаць, як пісаў да вашага бацькі, Адама. А калі ў які год не атрымаеце пісьма, то не пытайцеся, ці жывы я".

Пра гэтую вельмі цяжкую вандроўку на радзіму праз самы вялікі акіян Ігнат Дамейка паспеў падрабязна расказаць у кнізе "Мае падарожжы".

15 лістапада 1888 года І.Дамейка вярнуўся ў Чылі.

Пасля вяртання з радзімы пажыў у Сант'яга нядоўга — 23 студзеня 1889 года Ігнат Дамейка на 87-м годзе жыцця памёр. Перастала біцца сэрца нястомнага вучонага і патрыёта, члена многіх акадэмій і навуковых таварыстваў, аўтара 130 навуковых прац. Гэты дзень быў аб'яўлены ў Чылі жалобным. Над магілай Дамейкі выступіў з прамовай прэзідэнт рэспублікі Бальмацэда. Вучоны быў аб'яўлены нацыянальным героем Чылі.

Памяць пра Ігната Дамейку свята ўшаноўваецца ў далёкай паўднёваамерыканскай краіне. Яго імем названы вулканічны ланцуг гор у Андах працягласцю каля 350 кіламетраў, а таксама тысячакіламетровы хрыбет, які некалі называўся Атакамскія Кардыльеры, цяпер пазначаны на ўсіх картах як Кардыльеры Дамейкі. Прыгожы і светлы горад Дамейка знаходзіцца ў зялёнай даліне каля падножжа гэтага горнага хрыбта, а на самым беразе Ціхага акіяна ёсць і невялікі зацішны порт — Пуэрта дэ Дамейка. Усе гэтыя геаграфічныя мясціны названы ў гонар таленавітага і працавітага сына беларускай зямлі. У гонар Ігната Дамейкі быў выпушчаны памятны залаты медаль (да 30-годдзя яго дзейнасці). У яго доме быў створаны музей, а на адной з плошчаў Сант'яга ў 1902 годзе быў устаноўлены (да ягонага 100-годдзя) велічны помнік з выявай славутага беларуса з выбітым на граніце лаканічным надпісам на іспанскай мове — "Гранде Эдукадор", што ў перакладзе значыць — вялікі асветнік. Такімі словамі чылійскі народ увекавечыў памяць аб нашым земляку.

На яго магіле быў пастаўлены мармуровы абеліск.

Вучоныя таксама не абышлі ўвагаю навуковыя заслугі нашага земляка. Імя Ігната Дамейкі ўвекавечыў і вучоны свет. Нямецкі мінеролаг Гайдыйгер адкрыты І. Дамейкам у чылійскіх гарах мінерал назваў "дамейкітам", вядомы французскі палеантолаг Д'Арбіні аднаму са скамянелых малюскаў даў назву "наўтылус дамейкус", а прафесар Дзюдрэсной назваў адзін з аманітаў "аманітэс дамейканус", чылійскі батанік знойдзены і апісаны Дамейкам від горнай фіялкі назваў "віёла Дамейкана".

У 1997 годзе ў цэнтры вёскі Мядзвядка Карэліцкага раёна з'явіўся валун, на якім прымацавана таблічка з надпісам: "Мядзвядка — радзіма Дамейкі Ігната Іпалітавіча (31.07 1802 — 23.01.1889), геолага, натураліста, ганаровага члена Польскай акадэміі навук і многіх іншых еўрапейскіх АН, нацыянальнага героя Чылі". У Мядзвядкаўскай сярэдняй школе імя І.Дамейкі створаны музей Ігната Дамейкі. Яго ж імем названа вуліца вёскі, якая вядзе да школы.

Імя гэтага знакамітага даследчыка прысвоена і Крупаўскай школе Лідскага раёна. У сярэдзіне лістапада 1993 года выканкам Дзітвянскага сельскага Савета назваў яго імем новую вуліцу ў пасёлку Дзітва Лідскага раёна, а ў Заполлі, дзе Дамейка правёў частку свайго жыцця, устаноўлены мемарыяльны знак. Так сціпла ўшаноўваюць памяць вядомага чалавека на Гродзеншчыне.

У вёсцы Заполле Лідскага раёна ўзята пад ахову дзяржавы былая сядзіба вядомага беларускага вучонага-асветніка Ігната Дамейкі, які з 1823 па 1831 год жыў тут у свайго дзядзькі. На тэрыторыі сядзібы забаронена цяпер гаспадарчая дзейнасць. Мяркуецца, што з часам будзе праведзена і рэканструкцыя пабудоў.

Імя Ігната Дамейкі носіць універсітэт і нацыянальная бібліятэка Чылі, бібліятэка ў сталіцы Аргенціны Буэнас-Айрэсе, яно ўвекавечана памятнай дошкай на будынку Вільнюскага універсітэта, у экспазіцыях школьных музеяў Карэліцкага і Лідскага раёнаў. І гэта заслужаная даніна павагі нашаму земляку, спадчына якога належыць адначасова тром розным народам — беларускаму, польскаму і чылійскаму.

Мікола БАНДАРЭНКА,
вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Заканчэнне. Пачатак у №№ 38 – 41.

слухай сваё

ШОУ-БІЗНЕС ДЛЯ ДУШЫ

"Золак": "Зазірні ў неба". Мн., ZMKrecords, 2002, MC і CD

Беларуская плынь world music і new age ("Легенды Вялікага княства", "Юр'я", "Стары Ольса") апошнім часам мае тэндэнцыю папаўняцца за кошт рэлігійных спеваў (гл. дыскі "Святая ноч", "Святы вечар 2000" ды іншыя). У гэтай жа плыні і апошні альбом былога гурта "Золак", які мае назву "Зазірні ў неба".

Першае праслухоўванне абудзіць у дасведчанага меламана самы шырокі спектр аналогій: тут і славутыя брытанскія "Smokie" (новая аранжыроўка "Учора з вячора" вельмі нагадвае іхнюю "Don't play you rock-n-roll to me"), і наша родная "Крама" (песня "Светлы анёл" нават назвай сваёй падобная да хіта з альбома "Што дапаможа нам" (1992).

Зрэшты, што дзівіцца, калі ў склад "Золку" ўваходзіў небезвядомы Руслан Баёк (вакал, гітара), які пісаў многія тэксты менавіта той жа "Краме" (у каранаваным летась альбоме "Хавайся ў бульбу" яму належыць хіт "Дай мне шанец"). Што да "Золку", дык акрамя названых твораў рокавая рытміка выдае яго ў кампазіцыях "Сын, святы дух", "Выратуй душу", "Пілігрымка".

Rock-уплывы пакінуў тут і славуты ў 80-90-х гадах віцебскі гурт "Грамада", з рэпертуару якога паходзяць творы "Зямля і неба", "У начной цішы", "Хто да ясляў". Але не трэба разглядаць альбом "Зазірні ў неба" толькі ў стылістыцы класічнага рок-н-рола. Бо ёсць тут і кананічныя мелодыі XVI стагоддзя ("Анёл ад Бога Габрыэль"), і творы рэлігійных зборнікаў "Taize", "Прыходзім да Цябе".

"Розная жанравасць песень, — сцвярджае аўтар прадмовы да альбома, — дапасуецца да рознаканфесійнасці ўдзельнікаў гурта, сярод якіх ёсць прадстаўнікі ўсіх дамінуючых рэлігійных плыняў Беларусі, уключаючы каталіцкую, пратэстанцкую і праваслаўную".

Разам з тым, гэтая самая шматканфесійнасць гурта "Золак" зусім не пашкодзіла выдавецкай ініцыятыве "Задзіночання маладых каталікоў" (ZMK) заняцца гэтым праектам, і ён выйшаў у тыраж на дыхтоўных фірменных кампакт-дысках і касетах.

Звяртае на сябе ўвагу мастацкая аздоба альбома. Праект вокладкі належыць знакамітаму дызайнеру Зміцеру Герасімовічу (нагадаем аздобленыя ім альбомы "Палац. Лепшае", "Легенды Вялікага княства").

У складзе гурта ўдзельнічалі вакалісткі Святлана Шэйпа, Наста Барбарчук, Святлана Рагалевіч, гітарыст Зміцер Давідовіч, кларнетыст Уладзімір Глускер і перкусіяніст Васіль Санковіч. Але гэтага не хапіла для запісу альбома, і былі дадаткова запрошаны Павел Анісімавец (клавішныя) і Эльшад Бабаханаў (ударныя інструменты). Гэты калектыў працаваў у студыі У.Назарава ў 1998-1999 гадах, але доўгі час заняў пошук сродкаў на само выданне.

Дзякуючы прадзюсерскім здольнасцям Мечыслава Віткоўскага (прадпрыемства "Рытм") і фінансавай дапамозе фірм "Engeson-Ranila", "VIZA-group", "Santaki", "Ovis", "Holin", "MBL Travel" і "Gar Travel" гэта нарэшце стала магчымым, і на паліцах музычных крам з'явіўся добры аўдыёпрадукт для тых, хто ў музыцы шукае не банальных модных рытмаў, а сур'ёзных тэм, глыбокіх мелодый і грунтоўнай духоўнай ёмістасці.

Выдавецкая ініцыятыва "Задзіночання маладых каталікоў" (e-mail:zmk@tut.by) плануе і іншыя цікавыя выданні ды спадзяецца знайсці зацікаўленых людзей і сярод нашых чытачоў.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

любоў ды згода

Фота БелТА.

Траецкае прадмесце ў Мінску – традыцыйнае месца, якое наведваюць маладажоны ў дзень шлюбу. Некаторыя звяртаюцца да анёла «па хлопчыка».

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ Ў №40

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1. Перамога. 4. Падмога. 7. Засцярога. 10. Прага. 12. Туга. 13. Дапамога. 15. Увага. 19. Адвага. 20. Адлега. 23. Паслуга. 25. Чарга. 28. Вага. 29. Валацуга. 31. Конга. 32. Дарога. 33. Бадзяга. 34. Павага.

ПА ВЕРТЫКАЛІ. 2. Развага. 3. Акруга. 4. Пуга. 5. Аблога. 6. Папруга. 8. Сутарга. 9. Філенга. 11. Смага. 14. Перасцярога. 16. Калега. 17. Перавага. 18. Абслуга. 21. Падлога. 22. Раўнавага. 24. Асцярога. 26. Заўвага. 27. Скарга. 30. Цяга.

погляд

РОЗНАЕ ЖЫЦЦЁ РОЗНЫХ СТУДЭНТАЎ

Сярод вялікай колькасці мінскага студэнцтва вылучаюцца студэнты-замежнікі. Яны ходзяць на лекцыі, жывуць у інтэрнатах, але адрозніваюцца ад беларускіх студэнтаў. Асабліва гэта датычыцца кітайцаў, якіх вельмі шмат у БДУ.

Па-першае, яны амаль не сябруюць з мясцовымі, жывуць асобна нават у адным інтэрнаце і вядуць свой звыклы лад жыцця. Дзверы ў іх пакоі звычайна адчынены, і на ўвесь паверх пахне экзатычнымі стравамі: гатаваць яны мастакі. Кітаец, які вяртаецца ў інтэрнат з вялікімі сумкамі, поўнымі прадуктаў, — з'ява частая.

Па-другое, амаль усе яны мараць застацца ў Беларусі, таму што хочуць мець шмат дзяцей, а падобная раскоша не дазволена ў Кітаі. Яны падобраму зайздросцяць беларусам, якім пашчасціла мець сясцёр і братоў. Але шансаў застацца тут у іх амаль няма, таму што, нягледзячы на доўгае знаходжанне тут, мовы яны амаль не ведаюць, а нашы дзяўчаты не вельмі звяртаюць увагу на іх.

Па-трэцяе, самае вялікае адрозненне ад нашых студэнтаў у тым, што ў іх заўсёды ёсць грошы, і таму камп'ютэры, мабільныя тэлефоны і машыны мае кожны, хто жадае.

Але ёсць і аднолькавыя для студэнцтва рысы: яны таксама любяць піва, здаюць сесіі, кахаюць, сустракаюцца, развітваюцца, увогуле жывуць поўным жыццём.

Вольга ВАЙТУСЁНАК, студэнтка БДУ.

вандроўныя былі

ПЛАНЁР

Па дарозе ад Феадосіі да Какцэбеля наша сцяжына то забягала на сухія горы, то саскоквала ў нізіны, парослыя жоўтай травой.

Зеленаватыя воблакі ў небе нагадвалі выгнутыя хвалі.

На адным з пясчаных схілаў, усеяных белым з сіняватымі пражылкамі каменнем, мы прыселі адпачыць ля высокага чырвонага пастамента — пустога, без помніка. Адсюль добра было відаць вострыя шапкі Кара-Дага воддаль, блякла-зялёныя зараснікі на жоўта-шэрых схілах хрыбта, белыя дамкі пасёлка ля бухты.

Мы накіроўваліся да гары Хамелеон, якая высоўвалася далёка ў сінюю глыбіню мора. Нават адсюль можна было разгледзець, што гара мяняе колер штогадзінна, у залежнасці ад вугла, пад якім скіроўваліся на яе сонечныя промні. На той час Хамелеон ззяў жаўцізною, бы кавалачак сонца спусціўся пагасцяваць.

Накіраваўшыся туды, мы абмяркоўвалі з сябрам Алесем, чаму пуставаў пастамент, ля якога адпачывалі.

Прычыну тлумачыла мясцовае паданне. З ім нас, беларускіх турыстаў, пазнаёміў пастух, у якога ўдакладнялі дарогу на Хамелеон.

Той пастух уласнымі вачыма бачыў, як гадоў трыццаць таму на пастаменце ўзвышаўся планёр — помнік "вучлётам". У трыццатыя гады тут яны авалодвалі майстэрствам на хвалях ветру ўзнімацца вышэй за птушак. Для палётаў на планёрах тутэйшыя мясціны лічыліся найлепшымі ў Савецкім Саюзе: вятры з усіх бакоў сцякаліся ў створаную пляскатымі гарамі чашу і падхоплівалі планёры, бы марскія хвалі — човен.

Пасля вайны, каб ушанаваць памяць піянераў крымскага паветраплавання і забыць пра татараў, якіх выселілі, Кактэбель перайменавалі ў Планерскае, а на гары паставілі помнік у выглядзе планёра. Матэрыял для помніка шукалі нядоўга — падабралі падбіты знішчальнік, што ляжаў пад той гарой з 1944 года, ды пераплавілі ў паветраную мадэль.

Але жалеза, хоць і пераплаўленае, захоўвала памяць пра выбухі ў паветры ад зенітак і на зямлі ад авіябомбаў.

Планёр, узнесены на пастамент, усё роўна заставаўся знішчальнікам і не губляў надзеі, што ўсё ж выканае баявую задачу, якую не выканаў у сорак чацвёртым.

І аднойчы планёр узляцеў.

У тую зіму над паўночным узбярэжжам Крыма прашумела бура, якая пазрывала шмат чарапічных і драўляных дахаў.

Прыспеў час планёру ўзляцець — магутны подых ветру сарваў яго з пастамента і панёс у мора.

У планёра абудзілася памяць пра баявыя вылеты. І як ні дзьмулі шквальныя вятры з мутнага неба, з пачырванелага захаду і чорнага ўсходу, машына захоўвала роўны палёт на вышыні дзесяці метраў ад белых грэбняў. Калі наперадзе з'явіўся сухагруз пад чырвоным савецкім сцягам, планёр спікіраваў улева і абляцеў яго карму. Самалёт не мог нішчыць сваіх!

Праляцеўшы яшчэ кіламетраў дзесяць над морам, планёр спрытна зманеўраваў паміж двума віхравымі слупамі, якія высмоктвалі ваду ўнізе і выкідвалі за хмары, і раптам змяніў курс.

Пасажырскі трохпалубны карабель пад нямецкім сцягам рассякаў кілем шалёныя хвалі і разважна не набліжаўся да берага, каб не ўдарыцца аб скалы.

Манеўруючы пад павевамі ветру, планёр скіраваўся на карабель, як сокал на пеўня, пратараніў судна на ўзроўні другой палубы, праслізнуў праз рэстаранную залу ды вылецеў з другога боку лайнера. Хоць у рэстаране на той час нікога не было, але ўсе на караблі адчулі, як ён здрыгануўся, і пасажыры панацягвалі на сябе выратавальныя камізэлькі.

Дакладна невядома, ці даляцеў планёр да Турцыі, ці ўсё ж, калі бура сціхла, патануў. Дый не гэта галоўнае. Каб з'явілася легенда, дастаткова, што самалёт, нават пераплаўлены ў планёр, усё ж вылецеў на "баявое заданне"...

Менавіта пра тое, ці можа сталь захоўваць памяць, мы з Алесем і спрачаліся па дарозе да Хамелеона, пясчанік якога за паўгадзіны змяніў колер з жоўтага на зялёны, нібыта гара зацвіла.

Я адстойваў права неадушаўлёнай матэрыі — дрэва, пяску, каменя, жалеза — захоўваць памяць пра час і людзей. Алесь з'едліва аспрэчваў. Аднак звадка спынілася, калі мы наблізіліся да Хамелеона, які паружавеў у вячэрніх промнях.

Як часта здаралася ў Крыме, на хвіліну мы адчулі сябе часткай гэтага дзіва прыроды, і таму ўсялякія спрэчкі страцілі сэнс...

Ягор КОНЕЎ.

«Голас Радзімы»
Намеснік галоўнага рэдактара
Таццяна КУВАРЫНА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Тыраж 2 093 экз. Заказ 2367. Падпісана да друку 14. 10. 2002 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку» (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя, тэл./факс), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82.